

Віктар Кабац ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ФЕЛІКС ВАРАШЫЛЬСКІ ☞ 8



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2575) Год L Беласток, 18 верасня 2005 г. Цана 2,00 зл.

*З дня ў дзень прымаюцца выращэнні, якія вядуць да вясвятлення справы (...) У Мілейчычах сарганізаваны быў дабрачынны канцэрт, а грошы з яго прызначаны на рэабілітацыю найцяжэй пабітага хлопца...*

– 2 –

# Б’юць нашых

**Павятовую камендатуру Паліцыі ў Лосіцах адхілілі ад высвятляння справы пабіцця маладых жыхароў Мілейчыч і эвентуальнага прымянення зброі ды падазрэння ў гэтым паліцыянта. Справу ў маланкавым тэмпе высвятляе Раённая пракуратура ў Седльцах пад вокам Генеральнай пракуратуры.**

Стала гэта пасля заявы ў пракуратуру аднаго з пацярпеўшых і нашай публікацыі, з якою пазнаёмілася пракурор з Седльцаў, што вядзе справу. Два тыдні таму ў артыкуле „Б’юць нашых” апісалі мы ўсё здарэнне, якое выклікала шмат пытанняў. Прыгадаем. 29 ліпеня ў адпачынковым асяродку „Партнёр” ў Сэрпэліцах праўдападобна трох мужчын напала на некалькіх юнакоў з групы дзевяцёх адпачываючых там маладых жыхароў Мілейчыч. Адзін з іх трапіў у шпіталь, непрытомны, з цяжкім пашкоджаннем галавы ад пабояў бейсбольнай палкай. Іншы атрымаў агністрэльнае раненне. Сярод паліцыянтаў, якія прыбылі на месца здарэння, хлопец, якому ў час нападу прыкладвалі да жывата ружжо, пазнаў бандыта. У размове з „Нівай” наместнік каменданта павятовай Паліцыі ў Лосіцах рашуча пасля запэўніваў:

— Не было прымянення зброі і ўдзелу паліцыянта.

Сакрэтна рэагавалі лекары і кіраўнічка асяродка „Партнёр”. Справай заняліся мы пасля таго, як атрымалі ананімны ліст, аўтарства кагосьці спраўнага ў законе, а якога адрасатам быў міністр унутраных спраў. Аўтар меркаваў м.інш., што здарэнне мае ў кантэксце міжнацыянальную нянавісць. Гэты матыў у нашым журналісцкім следстве мы аспрэчылі, а прынамсі выклікаў ён нашы сумненні. Пацярпелыя прызналіся ў размове з „Нівай”, што — насуперак таго, што пісаў аўтар ананімкі — не слухалі яны ў асяродку запісаў беларускіх, польскіх, рускіх і ўкраінскіх гуртоў. Не мелі яны нават адпаведнага для гэтага абсталявання. Тым не менш гэтага матыву, пасля сабраных намі г.зв. доказных матэрыялаў, да канца нельга выключыць. Іншыя, якія кранае ананімка, значна больш верагодныя.

Пасля публікацыі артыкула мы справу зглыблялі далей. Атрымалі сігнал, што ў паліцыйным рапарце, перасланым 30 ліпеня ў Ваяводскую камендатуру Паліцыі ў Радаме з камендатуры ў Лосіцах, у якой меў працаваць стралюючы агрэсар-паліцыянт (?), не было ні слова аб скарыстанні ружжа і факце стралянін. Пацвердзіў гэта прэс-інфарматар радамскай Паліцыі Тадэуш Качмарэк. Пасля допытаў у камендатуры ў Лосіцах пацярпеўшы, якому агрэсар меў прыкладваць да жывата ружжо, як кажа прэс-інфарматар Качмарэк — быццам бы сцвердзіў, што паказаная яму асоба паліцыянта вельмі падобная на бандыта, але не прызнаў гэтага адназначна. Так прынамсі абвяшчаюць афіцыйныя дакументы з допытаў у камендатуры ў Лосіцах.

— Я не хачу канчаткова выказвацца ў гэтай справе. Аднак, нельга глядзець праз пальцы, — прызнаўся прэс-інфарматар.

Пасля першага нашага тэлефона размаўляў ён з камендантам у Лосіцах. Той меў заявіць, што ў час, калі мела месца тое здарэнне, сам ён быў у адпачынку. З таго можна меркаваць, што абасноўваў ён свае веды з прад’яўленых яму рапартаў, сярод іх з таго, што быў састаўлены адразу пасля інцыдэнту ў Сэрпэліцах.

— У гэтай справе лепш кантактавацца з пракуратурай у Седльцах, — дадаў прэс-інфарматар Качмарэк.

Аказалася, што пасля заявы аднаго з пацярпеўшых, Раённая пракуратура ў Седльцах адхіліла ад яе высвятлення Павятовую камедатуру Паліцыі ў Лосіцах. Нагляд над ёю мае Генеральная пракуратура. А Інспектарат Ваяводскай камендатуры паліцыі ў Седльцах высвятляе інфармацыі, якія змяшчаюцца ў заяве, якую атрымала. У канцы мінулага тыдня Раённая пракуратура ў Седльцах дапытвала хлопца, якому бандыт прыкладваў ружжо да жывата, і які падпісаўся пад заявай у пракуратуру. Яго паказанні былі настолькі верагоднымі, што вырашана было праверыць матыў бандыцкага ўдзелу паліцыянта і выкарыстання ім зброі.

— Яго паказанні пацвердзілі матыў удзелу паліцыянта. Не выключаем таго факту, — сцвердзіў у размове з „Нівай” выконваючы абавязкі прэс-іфарматара Раённай пракуратуры ў Седльцах пракурор Роберт Вянцкевіч.

У дні, калі закрывалі мы гэты нумар „Нівы”, на гэтую акалічнасць мелі быць дапытаны ўсе пацярпеўшыя. Раней сядлецкая пракуратура пачала высвятленне акалічнасцей пабояў маладога чалавека, які трапіў у шпіталь з вельмі цяжкім пашкоджаннем галавы. У канцы мінулага тыдня перавезлі яго на рэабілітацыю ў беластоцкі шпіталь. Пракуратура пацвердзіла таксама факт прымянення зброі, на што доказам з’яўляецца лекарская абдукцыя, у якой апісана агністрэльная рана аднаго з пацярпеўшых.

Пракуратура ў Седльцах дзейнічае вельмі хутка. Амаль з дня ў дзень прымаюцца чарговыя выращэнні, якія вядуць да вясвятлення справы. Можна спадзявацца, што таксама хутка будуць выяўлены віноўнікі і ў выпадку дастатковых прыкмет пацвярджаючых падазрэнне віны будуць ім пастаўлены абвінавачанні і справа будзе накіравана ў суд. Тым часам у Мілейчычах сарганізаваны быў дабрачынны канцэрт, а грошы з яго прызначаны на рэабілітацыю найцяжэй пабітага хлопца.

**Мацей Халадоўскі**



SPECJALISTYCZNY GABINET CHIRURGICZNY
*Marek Romanowski*
17-300 Siemiatycze, ul. Chopina 21
tel.086/ 655-60-31
REG. 050213027, NIP 544-101-84-11
10R 08244RL 2927

Siemiatycze 2005-08-0

OPINIA SĄDOWO – LEKARSKA

Poszkodowany lat , zam. ul. leg. się D.O. Nr AEJ podaje, że dnia 2005-07-30 został pobity przez dwóch nieznanych sprawców w Serpelicach. Początkowo został uderzony kijem w twarz a następnie z broni krótkiej postrzelony w brzuch. Okoliczności zajścia poszkodowany pamięta. Po zajściu zgłosił się na Izbę Przyjęć szpitala w Siemiatyczach, gdzie uzyskał pomoc lekarską. Lekarz stwierdził ( Karta Informacyjna Nr / 05 ):

Obecnie badaniem fizykalnym stwierdza się:

1) Wyłamanie zęba siekacza górnego, lewego, II-ego po stronie lewej.
2) Rozchwianie zęba siecznego górnego, lewego I-ego
3) Rana postrzałowa powłok brzucha, tuż powyżej prawego talerza biodrowego, przebiegająca od tyłu do przodu. Rana wlotowa wielkości około 0,8 cm z raną wylotową nieco większą około 1 cm. Obie pokryte strupami. W okolicy rany wylotowej podbiegniecie krwawe o powierzchni 7 x 4 cm.

*Фрагменты лекарскага абследавання, у якім апісана агнястрэльная рана і прыкметы ружжа*


## Крывая труба ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Газавую трубу будуць класці па дне Балтыйскага мора. Ад Расіі і аж да Нямеччыны. Наўпрост. Лепшую навіну наўрад ці мог падарыць нам лёс. Нарэшце збылося. Можа хоць зараз нашу Зямлю перастануць разглядаць як тэрыторыю, у якую хтосьці закапаў сваю трубу, і зараз, на падставе гэтага факту, лічыць яе сферай сваіх інтарэсаў...*

## Непашана свайго ☞ 2

Васіль Сакоўскі

*У нас усё наадварот. Не рвемся мы скарыстаць з задарма дадзенага зверху добрага і карыснага нам права, і некаторыя з нас проста аж рвуцца да змен там, дзе, на маю думку, змены нам толькі зашкодзяць. Напрыклад, пераход на новы стыль у царкоўных абрадах і ўвядзенне польскай мовы ў царкву — ад чаго так бараніліся (і абараніліся) нашы продкі...*

## Памяці Т. Саланевіч ☞ 4

Віктар Швед

*Тамара Саланевіч знаходзіла на Беласточчыне найлепшыя тэмы для сваіх фільмаў. З роднай зямлі чэрпала яна сваё творчае натхненне. Заўсёды бескампрамісная, мела паважныя клопаты з цэнзурай. Тамара Саланевіч цікавілася не толькі матэрыяльным, але і душэўным жыццём, праваслаўным веравызнаннем беларускага насельніцтва Беласточчыны...*





## Яўрэі ў Боцьках ☞ 9

Юрый Трачук

*Найбольшае зборышча яўрэйскіх дамоў і плошчаў знаходзілася навокал двух галоўных рынкаў мястэчка, а таксама ўздоўж яго галоўнай вуліцы Бельскай. Яўрэі жылі гэтаксама на Дубенскай, Браньскай і Залонскай вуліцах. Галоўны яўрэйскі раён мястэчка знаходзіўся ў ягонай сярэдне-заходняй частцы паміж праваслаўнай царквой і каталіцкім касцёлам...*

## Вокам турыста ☞ 11

Міхал Куптэль

*Маю прапанову ўласнікам агратурыстычных кватэр: няхай, замяніўшыся з суседам кватэрай, пажывуць некалькі дзён, абавязкова некалькі, як турысты. Думаю, што тады даведаюцца чаго бракуе і што дакучае турысту ў такой агратурыстычнай кватэры...*



# Крывая балтыйская труба

*Немцы чарговы раз дамовіліся з рускімі. Не, на гэты раз гэта нешта іншае, чым „знакамітая” Брэсцкая дамова 1918 года, калі яны старанна, каб не пакрыўдзіць адзін аднаго, дзялілі беларускія землі. І нават няма нічога агульнага з дамовамі канца трыццатых гадоў, калі беларусам „дазволілі” аб'ядналь заходнія і ўсходнія тэрыторыі, толькі ў складзе СССР і пад пільным яго кантролем. І нават не дамовы пра пастаўкі ў Нямеччыну расійскага газу праз тэрыторыю Беларусі і Польшчы. Наадварот. Яны дамовіліся, дзякуй Богу, Беларусь абмінуць. Газавую трубу будуць класці па дне Балтыйскага мора. Ад Расіі і аж да Нямеччыны. Найпрост. Лепшую навіну наўрад ці мог падарыць нам лёс. Нарэшце збылося. Можа хоць зараз нашу Зямлю перастануць разглядаць як тэрыторыю, у якую хтосьці закапаў сваю трубу, і зараз, на падставе гэтага фактару, лічыць яе сферай сваіх інтарэсаў. А ўсе іншыя, хто з тае трубы карыстаюцца, не адважваюцца нават запярэчыць „трубаўладальніку”.*

*Здаецца, яшчэ не паспеў сціхнуць скандал, калі Расія на пару дзён перакрыла сваю трубу і немцы першыя заявілі, што больш рускіх, як сур'ёзных партнёраў, разглядаць не збіраюцца. Што гэта былі пустыя словы ніхто і не сумняваўся. Партнёрства-сяброўства, ці непрыманне расійскіх метадаў уздзеяння на Беларусь, тут былі ні пры чым, бо ніхто з нямецкіх палітыкаў нават не адважыўся, хаця б для прыстойнасці, пракаментаваць заяву Пуціна, пра „ўваход” Беларусі „цалкам або часткамі” ў склад Расійскай Федэрацыі. Галоўным палітыкам у гэтым скандале быў толькі расійскі газ. І знакамітая труба, якая па волі лёсу ляжыць не там, дзе нам трэба. А спрачацца з гэтым расійскім „палітыкам” у немцаў не знайшлося аргументаў. Але зараз гэтая труба будзе купацца ў суровых водах Балтыкі. Аднаго аргумента, што рускія Беларусь кантраляваць проста мусяць, стане меней.*

*А вось палякі вельмі абурыліся такой нямецка-расійскай дамоўленасцю. На рускіх яны ніколі не разлічвалі. Але вось іх заходні сусед, прыяцель па Еўрасаюзе, вырашыў пазбавіць даходаў за транзіт расійскага газу польскую эканоміку, якая ў сваю чаргу, старанна выконвае ўсе нязвыклыя для яе еўрапейскія стандарты. Пра гэта немцы заявілі прама. Еўразвяз тут ні пры чым. На першым месцы, як заўсёды, інтарэсы нямецкай прагматычнай эканомікі. Ад гэтых інтарэсаў і будзе будавацца еўрасаюзная палітыка. І наконт месца праходжання трубы і наконт таго, што кожны мусіць ведаць сваё месца.*

*Ну а што наконт усяго гэтага сённяшняя беларуская ўлада? Маўчыць. Маўчаць афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі, маўчаць структуры „аб'яднанай беларуска-расійскай” дзяржавы, маўчаць эканамісты... А што тут скажаш? Зразумела, што тыя, хто будаваў эканамічную палітыку, зыходзячы не з працавітасці і рынкавай кемлівасці свайго народа, а з магчымасцей атрымліваць танны газ, сёння сказаць нічога не маюць. І не трэба. Іх ужо наслухаліся. Гэтак жа не трэба іхных каментараў, як і расійскай трубы. Можа транзіт газу і прыносіць у дзяржаўную скарбонку нейкія грошы, але колькі прыносіць праблемаў. То хай гэтыя праблемы абмінуць нас, разам з трубой.*

*Зразумела, што рускія, паклаўшы трубу ў Балтыцы, не адчэпяцца ад беларусаў і не зменяць сваёй палітыкі да нас. Затое немцам ужо стала адным аргументам меней, каб тым патакаць. Ды яшчэ якім аргументам! Мы зараз для іх ужо не „газавая камера”.*

*А вось новы газавод міжволі стане паўночнай мяжой патэнцыйнага эканамічнага ўтварэння. Мяжой краінаў, якія газавая труба абыдзе. Назваць іх можна „Балтыйска-чарнаморскім саюзам”. Дзесьці я ўжо гэтую назву чуў. Відаць у нашай Бацькаўшчыне ўсё ж ёсць прарокі.*

*Таму нам няма чаго маркоціцца з-за „страчаных” транзітнагазавых грошай. Трэба радасна „трубіць ва ўсе трубы Гродзенскія”, што нас абміне гэтая „крывая” труба. А без яе мы ўжо не „сектар газа”.*

**Віктар САЗОНАЎ (Гродна)**

# Шануйма сваё

*Усё ж такі мы, беларусы, неразумны народ. Усяго баімся і гатовы проста прасіць прабачэння за тое, што яшчэ існуем. Мала цэнім сваё. Замкнуліся ў сваёй „тутэйшасці” і далей ні кроку.*

*У нашым даволі цяжкім і моцна паблытаным мінулым можа гэта і было апраўдана — гэта быў спосаб на выжыванне. Але ўжо цяпер — у ніякім выпадку. І калі не скарыстаем з данага нам шанцу стаць паўнапраўнай нацыяй, затрацім не толькі нашу прымітыўную „тутэйшасць”, але і сябе. І гэта будзе непапраўнай нашай памылкай.*

*Вось данае нам права на падвойны запіс назваў нашых мясцовасцей і магчымасць выкарыстання нашай беларускай мовы як дапаможнай да агульнадзяржаўнай. Гэта ж цудоўная справа, дзякуючы якой яшчэ больш атракцыйнай стане наша Малая айчына і тым самым нашая тут меншасць. Нічагуткі не паменшыўшы і не зашкодзіўшы польскай мове, культуры і нашай польскай дзяржаве. Так, зрэшты, ёсць ва ўсіх цывілізаваных краінах, а дзе яшчэ няма, то хутка будзе.*

*Чаму ж тады ў нас з такой падазронасцю ўспрымаецца многімі гэтае права?! Нават некаторымі беларусамі. А ёсць нават такія мулы (нават сярод інтэлігенцыі), якія робяць уражанне як бы гэтым правам атрымалі аплявуху. І, канешне ж, адкрыта выступаюць супраць ажыццяўлення яго.*

*А гэта ж добрае, разумнае, карыснае права. Мясцовая назва, напрыклад, з'яўляецца найбольш праўдзівай, аўтэнтычнай назвай. У ёй захоўваюцца ўсе адценні яе. Пасля гэтага ўжо будзе цяжка маніпуляваць ёю, упрыгожваць ці дапасоўваць да розных тэндэнцый, што цяпер так моднае ў нас. Ды і нашыя будучыя, ужо спаланізаваныя, пакаленні будуць глыбей задумвацца над імі і нашымі справамі ды прабаваць дакопвацца да таго, хто тут сапраўдны аўтахтон.*

*Што тычыцца дапаможнай ролі беларускай мовы таксама адны выгады: лепей жа і прыгажэй выказацца па-свойму, як калечыць польскую мову. А хто не хоча ёю карыстацца, не мусіць.*



*Тады, напрыклад, не пасмеюць лаяць бацькоў у бальніцы (што я сам чуў і бачыў), што прывезенае імі дзіцё з нашай беларускай вёскі не ўмее гаварыць папольску. Або ў ”powizytacyjnych zaleceniach” куратарыйнага візітатара ў школе не знойдзецца такое, што тэмы ўрокаў беларускай мовы і літаратуры ў школьным журнале павінны быць запісаны на польскай мове. І гэтак далей...*

*Адмаўляцца ад гэтага права — проста смехата адна, публічнае прызнанне ўласнай дурноты. Гляньце як палякі пільнуюць гэтых спраў. І менавіта ад іх нам трэба вучыцца.*

*А ў нас усё нейк наадварот. Не рвемся мы скарыстаць з задарма дадзенага зверху добрага і карыснага нам права, і некаторыя з нас проста аж рвуцца да змен там, дзе, на маю думку, змены нам толькі зашкодзяць. Напрыклад, пераход на новы стыль у царкоўных абрадах і ўвядзенне польскай мовы ў царкву — ад чаго так бараніліся (і абараніліся) нашы продкі. А мы такія ўжо сталі разумныя, што бачым патрэбу такіх змен. Значыць, не хочам ушанаваць іх волі, бо лічым, што не мелі яны рацыі?*

*Ад самага нараджэння нашых дзетак стараемся цяпер навучаць іх і польскай, і англійскай, і нямецкай, і іншым мовам. І гэта, канешне, разумна, правільна. Чаму ж тады ў такой няласцы становіцца ў нас свая родная і царкоўнаславянская мовы?! Яны ж так верна служылі нашым мінулым пакаленням у міжлюдскіх зносінах і са святымі. А цяпер што, раптам сталі незразумелымі ім? Лічу, што гэта неразумна, і нават грэшна.*

*Чаму ж так упарта некаторым хочацца набліжаць нашу святую царкву да польскага касцёла? Адны святы, адна мова — гэта ж заціранне граніц і розніц між намі. І яны якраз паспрыяюць яшчэ часцейшаму пераходу праваслаўных вернікаў у каталіцызм і нашай паланізацыі. Відаць, пра гэта такім рэфарматарам і ходзіць.*

**Васіль САКОЎСКІ**

## Вачыма еўрапейца

# Перапросіны



*Я пад уражаннем тых фактаў, якія паявіліся на медыяльным рынку. Першы — гэта прапанова прэм'ера Марка Бэлькі, які запрапанаваў непрызнаванай беларускімі ўладамі старшыні Саюза палякаў Беларусі прыняць ганаровую пасаду консула РП у Беларусі.*

*— Я вельмі ўдзячная і для мяне гэта вялікі гонар, але я перш за ўсё — старшыня СПБ, — дыпламатычна паставілася да прапановы старшыня Борыс.*

*Цяжка не пагадзіцца з адным з дзеячаў непакорнага СПБ Анджэем Пачобутам, што прапанова польскага прэм'ера — выразны знак падтрымкі кіраўніцтву непрызнаванай арганізацыі. Аднак у практычным маштабе прызнаць трэба рацыю былому польскаму паслу ў Мінску Марыюшу Машкевічу, які ў размове з газетай „Rzeczpospolita” заявіў:*

*— Тае пасады не ахоўвае консульскі імунітэт. Яго прыняцце можа стаць прычынай у адносінах да яе разгару адмоўнай прапаганды, што Анжаліка Борыс польскі службовец, што бярэ грошы ад нашых улад.*

*Вылучэнне прэм'ерам Бэлькам у сапраўднасці можа аказацца „мядзвежай прыслугай” так для самой Анжалікі Борыс, як і яе саюза. Падобна, як сустрэча з еўрадэпутатамі ды генеральным сакратаром Савета Еўропы ў Страсбургу, куды выбралася яна зараз жа пад крыламі кандыдата на прэзідэнта Дональда Туска. Таксама ў гэтым кантэксце цяжка здзіўляцца прапагандзе, якую вядзе хоць бы пралукашэнкаўскі былы старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі, што такія жэсты, як назначэнне на пасаду ганаровага консула гэта „давыбарчая гульня польскіх палітыкаў”. Маю ўражанне, што ў Польшчы палітыкі ў сапраўднасці не ведаюць як дапамагчы дэмакратычна выбраным у сакавіку ўладам СПБ, як паводзіць сябе ў выпадку непрадбачлівай адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі.*

*Недахопам меры і няўмеласцю ў паводзінах выказваўся за дванаццаць апошніх гадоў „Kurier Poranny” ў адносінах да прызнаванага ўсім светам мастака з Валіл і аднаго з бацькоў фестывалю „Басовішча” Лявона Тарасэвіча. Урэшце ў канцы мінулага тыдня рэдакцыя апублікавала перапросіны. У гэтым канфлікце справа была ў нежаданні „Кур'ера” апублікаваць паясненні Лявона Тарасэвіча пасля аднаго з артыкулаў пра „Басовішча”. Больш таго, праз пару гадоў той канфліктуючы артыкул быў перадрукаваны, з чарговымі палемічнымі заўвагамі. Цяпер рэдакцыя заявіла: „Не хапіла адвагі і ўяўлення, а напэўна пакоры, каб сказаць «просім прабачэння» і прызнацца да памылкі. На тое, каб прызнацца ў памылках ніколі запозна — сёння хочам прасіць даравання ў Лявона Тарасэвіча і выказаць шкадаванне за гадамі працягваючыеся недаразуменні і спрэчкі”.*

*Калі размаўляў я з Лявонам Тарасэвічам, той сцвердзіў, што ён задаволены:*

*— Гэтак павінна быць. Змест тае заявы мы ўзгаднілі разам.*

*Гэтак прынамсі адзін канфлікт з удзелам тутэйшага беларуса як пакрыўджанага здаецца быць закрыты. Ці за гэтым прыкладам пойдуць іншыя?*

*Урэшце трэці факт, які выклікаў на мне ўражанне. Міністр культуры Вальдэмар Дамброўскі назначыў 14 асобам з Падляшша выдуманыя сабою, а ўстаноўленыя Сеймам узнагароды Gloria Artis. Маюць яны заміняць адзнакі „Заслужаны для польскай культуры” і „Заслужаны дзеяч культуры”. Атрымалі яе таксама беларусы: успомнены тут Лявон Тарасэвіч, пісьменнік Сакрат Яновіч, паэт Віктар Швед, фатограф Віктар Волкаў, разьбяр Уладзімір Наумюк, дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук. Такі прыгожы жэст на канец паўнамоцтваў гэтага парламента і ўрада.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

*В. Кабац: У Педагагічным ліцэі ў Бельску-Падляшскім па-беларуску мы вучыліся на занятках роднай мовы, матэматыкі, гісторыі і геаграфіі. У школе любіў я чытаць літаратуру, а сярод беларускіх кніжак найбольш любіў „Новую зямлю”...*

# Жыццё з мастацтвам

**Размова з Віктарам КАБАЦАМ, вядомым гайнаўскім мастаком і любіцелем прыроды.**

***— У галерэі „Гайна” Музея беларускай культуры ў Гайнаўцы нядаўна была адкрыта выстаўка Вашых мастацкіх прац. Гэтая падзея супадае з 70-годдзем з дня Вашага нараджэння. Якія перыяды Вашай творчасці прадстаўлены на выстаўцы?***

— На ўсіх маіх працах паказана Белавежская пушча і яе клімат і таму я назваў выстаўку „Радзімыя дрэвы мае, мае другі старыя” — гэта цытата з беларускага перакладу „Пана Тадэвуша”. Самыя старыя працы адносяцца да перыяду, калі я пачаў маляваць Белавежскую пушчу. Побач старэйшых карцін я прадстаўляю працы выкананыя зусім нядаўна. На выстаўцы знаходзяцца разнародныя пушчанскія краявіды і адзінокія дрэвы з чорна-белым кантрастам. На сваіх работах я паказваю не толькі выгляд дрэў, але іх характар, колеры і клімат вакол іх.

***— У апошніх перыядах Вашай творчасці, за невялікімі выключэннямі, узнікалі працы з пушчанскімі краявідамі. Аднак раней былі ў Вас разнародныя матывы.***

— Раней я маляваў партрэты людзей, краявіды гор і крыху займаўся разьбой. Намаляваў я таксама многа краявідаў беларускіх вёсак з наваколля Нараўкі.

***— Вы дзяцінства правялі ў Беглюках?***

— Гэта народнае названне маёй роднай вёскі, бо выдатную большасць жыхароў складалі людзі з прозвішчам Бяглюк і было толькі дзве сям’і Кабацаў. Афіцыйнае названне вёскі Мінькоўка і знаходзіцца яна непадалёк ад Нараўкі.

***— Ці будучы вучнем падставовай школы і пражываючы ў роднай вёсцы, Вы ўжо марылі заняцца мастацтвам?***

— У падставовай школе я выконваў ілюстрацыі да літаратурных твораў. Да гэтай работы заахвочвала мяне мая выхавацелька Аліцыя Стульгіс. Бацькі любілі мае рысункі і вешалі іх у вялікім пакоі каля ложка. Мае бацькі, Ян і Марыя, былі простымі людзьмі, гаспадарылі на трох гектарах зямлі. Аднак галоўны даход для ўтрымання нашай сям’і быў з працы ў лесе. Бацькі дапамагалі здабываць адукацыю мне і брату Яну, які стаў вядомым архітэктарам. Трэці брат, Славік, працаваў сталяром.

***— Вы пачалі адукацыю ў цяжкіх ваенных умовах?***

— Я пачаў вучыцца ў беларускай школе. З першага па чацвёрты клас усе ўрокі вяліся на беларускай мове. Быў гэта ваенны перыяд і першы школьны год пасля вайны. Толькі ў пятым класе мы пачалі вучыцца чытаць на польскай мове і пісаць па-польску. Нам блыталіся кірылічныя і лацінскія літары і здаралася, што ў час дыктоўкі на польскай мове мы рабілі нават па 30 памылак.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Віктар Кабац каля работ з апошняга перыяду творчасці

***— Як было з вучобай беларускай мовы, калі Вы вучыліся ў старэйшых класах?***

— Пасля, апрача заняткаў па беларускай мове, па-беларуску мы размаўлялі на ўроках матэматыкі і практычных заняткаў. Пазней я паступіў вучыцца ў Педагагічны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. Там па-беларуску мы вучыліся на занятках роднай мовы, матэматыкі, гісторыі і геаграфіі. У школе любіў я чытаць літаратуру, а сярод беларускіх кніжак найбольш любіў „Новую зямлю” Якуба Коласа. У маёй роднай хаце ніхто па-польску не гаварыў. У вёсцы таксама размаўлялі амаль на літаратурнай беларускай мове і таму вучоба польскай мове мне прыходзілася цяжка.

***— Ці пасля вучобы ў Бельску-Падляшскім Вы адразу распачалі адукацыю ў вышэйшай мастацкай установе?***

— Па-сур’ёзнаму мастацтвам зацікавіў мяне мой настаўнік рысунку і жывапісу Сцяпан Мінцэвіч. Аднак пасля вучобы ў педагагічным ліцэі паступіў я на спецыяльнасць жывапісу і мастацтва ў Настаўніцкую школу ў Лодзі і праз год працаваў настаўнікам. Пасля рашыўся паступіць на Аддзяленне выяўленчага мастацтва Універсітэта ў Торуні і там здабыў вышэйшую адукацыю.

***— Торунь быў ужо тады вялікім горадам. Ці цяжка было хлопцу з невялікай беларускай вёскі дабіцца поспехаў у гарадскім асяроддзі?***

— Ні ў Лодзі, ні ў Торуні я ніколі не скрываў, што я беларус. Мае сябры з Торуні нават былі зацікаўлены беларускасцю. Прасілі, каб я паразмаўляў з імі па-беларуску. Нават я вазіў ім паказаць „Ніву”, якая тады была яшчэ простай газетай. Мастакі крыху інакш глядзелі на свет, чым іншыя людзі.

***— Ці ў час вучобы Вы ахвотна вярталіся ў родныя Беглюкі?***

— Я вельмі дрэнна адчуваў сябе ў вялікім горадзе, а асабліва ў Лодзі, дзе была вялікая колькасць заводаў. Калі я прыязджаў у час канікулаў дамоў, не выязджаў у лагеры і вельмі ахвотна хадзіў адпачываць у Белавежскую пушчу.

***— Можа і таму Вы рашыліся вярнуцца працаваць на Гайнаўшчыну?***

— Калі я вярнуўся ў Гайнаўку, яна была больш падобная на вёску, чым на горад. Спачатку я год працаваў у Падставовай школе ў Чаромсе, пасля два гады вучыў у Падставовай школе н-р 5 у Гайнаўцы. Найбольш часу, бо ажно 22 гады, я перапрацаваў на пасадзе настаўніка мастацтва ў Агульнаадукацыйным ліцэі імя Мар’і Складоўскай у Гайнаўцы і з гэтай пасады я пераймоў на пенсію. У тым часе я адзін год працаваў на пасадзе дырэктара Гайнаўскага дома культуры. Аднак праца чыноўніка мне не падыходзіла, а ў дробязях трэба было пытацца ў людзей з Польскай аб’яднанай рабочай партыі і я вярнуўся на настаўніцкую работу.

***— Вы належалі да „Салідарнасці” ў школе.***

— Мы заснавалі першы гурток „Салідарнасці” ў Гайнаўцы. Належалі да яго палякі і беларусы. Перад самаўрадавымі выбарамі пры структурах „Салідарнасці” ў Гайнаўцы пачаў нават арганізавацца беларускі выбарчы камітэт, але пасля ён раскідаўся.

***— Будучы на пенсіі Вы па-сур’ёзнаму пачалі займацца маляваннем краявідаў Белавежскай пушчы.***

— Першыя мае карціны былі амаль рэалістычнымі. Пазней я пачаў шукаць тэхнік, якія дазволілі б захаваць клімат пушчы і паказалі б яе непаўторнае асяроддзе. Сваю галоўную тэхніку я назваў аквашклом. Выконваючы карціны, я разліваю фарбы на палатно і прыціскаю шклом. У гэты момант узнікаюць галоўныя матывы на рабоце.

***— Апрача малявання пушчы Вы актыўна змагаецеся за яе ахову.***

— Я з дзяцінства цікавіўся Белавежскай пушчай, а малюючы яе заходзіў у розныя яе куткі. Калі сядзіш пад чатырохсотгадовым дубам, можна задумацца аб сваім жыцці і жыцці дрэва. Тады ўзнікае боязь, што чалавек можа прыйсці і знішчыць яго. Змаганне за ахову пушчы цесна спалучанае з маім мастацтвам.

***— Летам Вы многа часу праводзіце каля Семяноўскага вадасховішча. Можа чарговыя Вашы работы будуць адлюстроўваць водныя краявіды?***

— Семяноўскага вадасховішча я не малюю, бо там натуральныя краявіды былі зменены людзьмі і страцілі сваю прыгажосць.

***— Вы многа грамадска працуеце пры арганізаванні мастацкіх выставак у гайнаўскіх культурных установах.***

— Я быў ініцыятарам заснавання галерэі ў гарадской бібліятэцы, якая пасля была перанесена ў музей і атрымала названне „Гайна”. Люблю працаваць з людзьмі і дапамагаць мастакам паказваць іх работы.

***— Дзякую за размову, жадаю плённай працы і святкавання чарговых дзесяцігоддзяў.***

**Гутарыў Аляксей Мароз**



Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Віктар Кабац паказвае работы прысвечаныя генацыду ў Курапатах („Трыялогі 2005”)

## У Нараўцы

Гмінная водная суполка „Лазовае” мае ўтульны пакойчык у Гміннай управе ў Нараўцы. Сёлета памянялася праўленне суполкі і ў 2-3 разы павялічыліся паявыя ўзносы ў параўнанні з мінулагоднімі. Напрыклад, за 30-аравую плошчу зямельных угоддзяў складчыны выраслі з 4,50 зл. на 10,70 зл.!

29 жніўня г.г. Гмінная водная суполка „Лазовае” выслала пенсіянерцы М. Ц. (прозвішча вядомае рэдакцыі), інвалідцы I групы з Новага Ляўкова напамін да платы паявой складчыны за 2005 год ды ўжо належныя з-за запазычанасці ў суме 19,10 зл. Адкуль узяліся тыя 8,40 зл. запазычанасці? За паштовую марку? Ды яшчэ М. Ц. трэба, а як жа, папалохаць, цытуем: „W razie niewpłacenia należności we wskazanym terminie tj. w ciągu 7 dni od dnia doręczenia na rachunek BS Brańsk, zostanie wszczęte postępowanie egzekucyjne w celu przymusowego ściągnięcia należności w trybie egzekucji administracyjnej, co spowoduje dodatkowe obciążenie kosztami egzekucyjnymi”. Пры ўсім гэтым невядома, чаму плаціць у Кааператыўны банк у Браньску, калі яго аддзел знаходзіцца ў Нараўцы.

„Лазовае” працуе перш-наперш разумова за пісьмовым сталом. Перад усім высылае напаміны і палохае. Летам яна павінна, між іншым, скасіць траву на меліярацыйных равах. Аднак роў, ад якога 100 метраў далей знаходзіцца 30-аравая палоска 85-гадовай бабулі з Новага Ляўкова, сёлета яшчэ не бачыў касца. Гэта мы праверылі 30 жніўня г.г. Гэты роў на ўсёй яго даўжыні зарос чартапалохам ды іншым пустазеллем. А бабуля не мае ўжо сілы займацца земляробствам. На яе палосцы пачаў ужо расці лес-самасей. А хто зацікаўлены, дык едучы з Новага Ляўкова ў бок Бандароў за вёскай няхай гляне на той зарослы роў. Гмінная водная суполка ім не пацікавілася. **(мох)**

## У Заблудаве

Найгорш занядбанай вуліцай у мястэчку Заблудаў з'яўляецца вуліца Хадкевіча, якая пачынаецца ад каталіцкага касцёла ў напрамку праваслаўных могілак і далей, на маю думку, павятовай дарогі ў Дзіцячы дом у Красным. За стан гэтай вуліцы нельга адназначна абвінавачваць бурмістра Заблудава, але, перш за ўсё, жыхароў вышэйуспомненай вуліцы, бо калі бурмістр хацеў пракласці каналізацыйныя трубы для сцёкаў і паставіць дзеля гэтага неабходную перапампоўню, дык прыватныя ўладальнікі не пагадзіліся, каб праз іхнія сядзібы пракласці каналізацыйныя трубы.

Гэтай вуліцай, калі едзеш на рынак, што знаходзіцца насупраць праваслаўных могілак, дык можна паламаць легкавую машыну. І каго тады абвінавачваць — бурмістра Заблудава, які хоча зрабіць там як найхутчэй парадак, ці Павятовае староства ў Беластоку? Павятовыя ўлады павінны паразумецца з гміннымі ўладамі і як найхутчэй навесці парадак на вуліцы Хадкевіча ў Заблудаве. **(мл)**

# Памяці Тамары Саланевіч



Фота АНДРЭЯ РУСАЧЫКА

Пад такім лозунгам 6 верасня г.г. у лекцыйнай зале Гміннай публічнай бібліятэкі ў Нарве, на фоне маляўнічай дэкарацыі — вясковай беларускай хаты, студні і жоўтых сланечнікаў — адбылося цікавае мерапрыемства прысвечанае памяці вядомага тэлежурналіста, рэжысёра і дакументаліста, праграмнага дырэктара Беластоцкага аддзялення Польскага тэлебачання Тамары Саланевіч у пятую гадавіну яе смерці.

Імпрэзу падрыхтавалі працаўнікі Бібліятэкі пад кіраўніцтвам яе дырэктара Анны Андраюк-Савіцкай.

Прысутнічалі запрошаныя госці: пасол Сейма Яўген Чыквін, яго жонка, прафесар Універсітэта ў Беластоку Альжбета Чыквін, прадстаўніца Беластоцкага тэлебачання Кацярына Паплаўская, войт Нарваўскай гміны Якуб Садоўскі, старшыня Рады гміны Яўген Дудзіч, член Павятовай рады, лекар, мой зямляк з Мора Сцяпан Кучынскі, праваслаўны святар з Ласінкі Георгій Кос і мая скромная асоба.

Прыбылі таксама на імпрэзу вучні трэціх класаў мясцовай гімназіі і жыхары Нарвы.

Аб жыцці і творчым шляху Тамары Саланевіч змястоўна расказалі Магда Дудзіч і Януш Русачык.

Дзякуючы настаўніцы інфарматыкі Івоне Сідарук, якая прывезла з Нараўкі копіі фільмаў Тамары Саланевіч і адпаведную апаратуру, прысутныя паглядзелі фільмы „Андрэй і Маня” — аб цяжкім побыце вясковых беларускіх старэчаў; фільм „Мелодыя душы” — аб невідучым музыканце з вёскі Трывежа Мікалаю Пракапюку, які ў пасляваенны перыяд, будучы дзесяцігадовым хлапчуком, страціў зрок ад выбуху знойдзенага ў полі снарада; фільм „Ці чуеш як плача зямля?” — аб затапленні вадой Семяноўскага вадасховішча шасці беларускіх вёсак у вярхоўях Нарвы.

Пасля паказу фільмаў Тамары Саланевіч адбылася цікавая мастацкая частка, у якой шмат беларускіх народных песень праспявалі салісткі Магда Дудзіч і Мажэна Русачык, а таксама мастацкі маладзёжны калектыў з Ласінкі, які дзейнічае пры Асяродку культуры ў Нарве.

У наступнай частцы багатай праграмы выказваліся запрошаныя госці. Яўген Чыквін падкрэсліў, што Тамара Саланевіч знаходзіла на Беласточчыне найлепшыя тэмы для сваіх фільмаў. З роднай зямлі чэрпала яна сваё творчае натхненне. Заўсёды бескампрамісная, мела паважныя клопаты з цэнзурай. Ён, як пасол, выступаў у абароне яе фільмаў, дапамагаў абмінаць пастаянныя рыфы. Тамара Саланевіч цікавілася не толькі матэрыяльным, але і душэўным жыццём, праваслаўным веравызнаннем беларускага насельніцтва Беласточчыны. Найлепшым гэтаму доказам з'яўляецца яе фільм „Жэртва” — аб ахвярным паломніцтве праваслаўнага насельніцтва на Святую Гару Грабарку.

Альжбета Чыквін у надта цікавы спосаб прадставіла постаць Тамары Саланевіч: прыгожая жанчына з вонкавай і душэўнай прыгажосцю. Да глыбіні душы кранალі яе людскія няшчасці. Любіла падглядаць побыт людзей, вылаўліваючы з яго найбольш істотныя моманты. Жыла яна ўсім тым, што хвалявала асабліва вясковых людзей з беларускага асяроддзя.

Кацярына Паплаўская сцвердзіла, што Тамара Саланевіч выхоўвала ў тэлебачанні маладых людзей, энтузіястаў і прадаўжальнікаў ідэй, якімі яна цікавілася і якія ажыццяўляла ў штодзённай працы.

Я ў сваім выступленні падкрэсліў, што мы з Тамарай Саланевіч былі братнімі душамі. Яна апявала складанае штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў сваіх аўтэнтычных змястоўных фільмах, а я раблю гэта пастаянна ў сваёй паэзіі. Прачытаў я верш прысвечаны памяці Тамары Саланевіч, у якім успомніў, што яна намервалася зрабіць фільм аб маіх паэтычных дасягненнях ды, на жаль, не паспела гэтага здзейсніць.

Надта ўсхваляваўся я трагічным лёсам Мікалая Пракапюка з вёскі Трывежа, прадстаўленым у фільме Тамары Саланевіч „Мелодыя душы”. Прысвяціў я невідучаму музыканту верш, які выслаў на яго адрас.

Якуб Садоўскі ў выступленні падсумоўваючым імпрэзу ў гонар Тамары Саланевіч сказаў, што яна можа быць узорам для пераймання, асабліва для маладога пакалення беларусаў.

**Віктар Швед**

# Gloria нашай культуры!

— Тое, што я апынуўся сярод такіх выдатных творцаў і дзеячаў культуры, гэта вельмі для мяне прэстыжная справа, — заявіў Сяргей Лукашук з Бельска-Падляшскага, лаўрэат медаля *Gloria Artis*, — тым больш, што мой білет мае нумар 5. Я вельмі рады і ўсхваляваны, бо гэтым ушанаваны мае больш за 40 гадоў працы ў культуры і ў аматарскім руху — як дзеяча культуры, дырыжора, апекуна мастацкіх калектываў. Гэта пашана і для Бельскага дома культуры і маіх супрацоўнікаў, якіх віншаваў я з нашай супольнай узнагародай.

9 верасня, у час інаўгурацыі новага мастацкага сезона ў Падляшскай оперы і філармоніі (новая назва ўстановы) міністр культуры Вальдэмар Дамброўскі, ганаровы госць, уручыў медалі *Gloria Artis* чатырнаццаці творцам, якія ад гадоў плёна ангажуюцца ў культурную дзейнасць у нашым ваяводстве.

Медаль „Заслужаны для культуры — *Gloria Artis*” устаноўлены нядаўна, 20 ліпеня 2005 года. Прысвойвае яго міністр культуры індывідуальнасцям са свету культуры, маючым асаблівыя заслугі на гэтай ніве. У медаля тры ступені — залатая, срэбная і брознавая. Узнагароджваюцца імі найбольшыя артыстычныя дасягненні. Медаль вышэйшай ступені можна атрымаць толькі пасля 5 гадоў ад атрымання ўнашавання ніжэйшай ступені, хоць у выпадках найбольш знакамітых дасягненняў можна адступіць ад таго патрабавання. Медаль прадстаўляе сабой стылізаваную кветку, у цэнтральнай частцы якой — Арол у кароне, а на сярэдзіне рэверса — твар жанчыны ў лаўравым вянцы, вышэй — надпіс: *Gloria Artis*. Да гэтай пары медалі „Заслужаны для культуры — *Gloria Artis*” атрымалі м.інш. Стэфан Стулігрош ды першы замежны мастак — Мікіта Міхалкоў (залатыя).

Лаўрэатамі медаля *Gloria Artis* з Падляшскага ваяводства сталі: ***залатога*** — **Анджэй Струміла** — мастак, ***срэбнага*** — **Лявон Тарасэвіч** — мастак, **Сакрат Яновіч** — пісьменнік, **Віктар Волкаў** — мастак-фатограф, **Віктар Швед** — паэт, публіцыст, перакладчык, **Кшыштаф Чыжэўскі** — аніматар культуры, эсэіст, перакладчык, **Кшыштаф Рау** — рэжысёр, аўтар тэатральных твораў; ***бронзавага*** — **Уладзімір Наумюк** — народны разьбяр з Канюк, **Сяргей Лукашук** — аніматар культуры, дырэктар Бельскага дома культуры, **Зыгмунт Цясельскі** — этнограф, **Моніка Шэўчык** — гісторык мастацтва, куратар выстаў, **Яніна Язерская** — мастак-дызайнер з Гайнаўкі, **Казімір Ушынскі** — музейнік, **Люцына Сыта-Пракапюк** — аніматар музычнай культуры. Значыць, з 14 асоб, ушанаваных найвышэйшай культурнай узнагародай, значная частка гэта беларусы, бывае, больш вядомыя ў свеце прадстаўнікі мастацтва, чым іншыя творцы і дзеячы культуры з Падляшша. **(лук)**

**Добры пан**

**— 6 —**

— Tylko nie mówcie słowa „szukamy”, — павучаў нас яшчэ пад Дукляй пан доктар ад петардаў, — bo to na Słowacji znaczy *pierd...*!

Каб не ляпнуць якой непрыстойнасці, мы прынцыпова трымаліся адно свойска-падляшскай мовы. Ды, пасля кінаманскага сеанса ў Міковай, нам адхацелася чаго-колечы шукаць. Едучы цягнікам паўз раку Ляборац, мы спазіралі на горы і хмары, якія, здавалася, складваліся ў непрыстойныя эратычныя канфігурацыі. Уяўленне накідалі не толькі непрыстойныя фільмы з-пад знаку „Фабрыкі”, але і афрыканская жара, якая нашым следам хлынула ў Карпаты.

У Гумэнным мы прызямліліся без толку і плану, ужо на змярканні. Ля галоўнага вакзала выседжвалі хмары цыганоў. Карціна прыгадвала малюнкі з даваенных мястэчак сярэднееўрапейскай задрыпоніі. Хоць тады, замест цыганоў, выседжвалі яўрэі, якія дзень і ноч пільнавалі сваіх інтарэсаў. Нашы цыганы не напаміналі бізнесменаў. Хутчэй бежанцаў, якія выпадкова апынуліся сярод гор і далінаў, каб пасля адпачынку рушыць у далейшую вандроўку. У іх смуглявасці і нерухомасці адчуваўся прысмак індускай вуліцы. Праўда, замест рамантыкі, якую абяцаюць нам цыганска-беларускія песні, мы адчулі непрыстойны ляк, які ўзнікае на этнічным сумежжы.

— *Шукаем* таннага пансіяната, — ляпнулі мы дрыжучым голасам першаму таксісту, які выседжваў у чырвоным „Мерседэсе” і, ад нуды, кусаў ногці.

— *Pan wszystko wie,* — адказаў хітра шафёр, ды, як прыстоіць у бізнесе, яшчэ і сам сябе пахваліў: *Pan dobry, pan nie oszuka!*

* * *

Наступныя дзве гадзіны мы кружылі па заспаных вуліцах Гумэннага. Владымір — наш шафёр — усё захапляўся гаспадарчым цудам у Польшчы. Асабліва маркамі машын, на якіх прыязджаюць нашы турысты.

У Гумэнным шмат аквапаркаў, якія чамусьці ўпадабалі грамадзяне Польшчы.

— Па две-тры нядзелі ў нас цэлымі сем'ямі мокнуць, — дзіваваўся Владымір.

Ён сам толькі раз быў у Польшчы — і не як турыст, а чорнарабочы.

— Pan wie, że u was Ameryka, — паўтараў як мантру таксіст, — ale pan dobry, pan nie oszuka...

# Сонца Карпатыі



Наш хвалько з кожнай мінутай ставаўся ўсё больш падазроным і калі паўтараў што не „oszuka”, здвалася — чуем няшчаснае: „szukam”!

У Гумэнным лепш не прызнавацца да беларускасці. Вось, нашаму Владыміру беларусы явіліся яшчэ большымі бізнесменамі і багацеямі за палякаў.

— Pan wie, że u was najlepiej! — мармытаў пад носам, калі пералічваў нашы грашакі, якія ў нервах збіралі мы па ўсіх кішэнях.

* * *

Хоць Владымір яўна надзьмуў нас у дудку, знойдзены ім „пансіянат” перайшоў усякія спадзяванні. Калі мы апынуліся ў пакойчку і трапяталі ад страсцяў, зноў прыгадалася перасцярога пана доктара:

— А раптам мы прывіталі швейцара тэкстам: *шукаем* начлегу!?

Пасля аплаты рахункаў мы апынуліся ў інтэрнаце на паверсе, які напамінаў... вайсковыя казармы. Калідорам шпацыравалі табуны маладзёнаў, многія з іх у „касцюмах Адама”. Хоць найбольшыя сюрпрызы чакалі ў супольным для жанчын і мужчын туалеце. Пад душам быццам дэльфіны бессаромна купаліся смуглявыя і белабрысыя кавалеры, якія на наш від гучна рагаталі. Пад уплывам яўнай парнаграфіі (якую зноў зафундаваў нам бессаромны Эндзі), мы былі вымушаны мыць зубы з закрытымі вачыма.

Пасля трывожнай ночы, калі адвалакалі фатэлі ад дзвярэй, што разам з трыма замкамі і малітвамі былі нам барыкадай, мы адчулі мудрасць славянскай перасцярогі, што лепш у Гумэннае выправіцца з мужыкамі!

* * *

Гумэннэ зачаравала яшчэ раз з самога рання. Калі рашучым крокам мы спяшалі ў бок вакзала, перад вачыма адкрылася знаёмая карціна. Напамінала яна васьмідзесятыя гады ў Гайнаўцы, калі вуліцай і тратуарамі народ валіў на працу. Маладыя, старыя, сталага ўзросту — поўная сацыяльная праслойка грамадства. Сам краявід быў падобны на індустрыяльную паштоўку. Цёмныя горы, якія з усіх бакоў прытуліліся да глыбы горада, былі як гурбы вугалю. Эфект мацавалі фабрычныя каміны, што тырчэлі ў фоне.

На вакзал мы ішлі няцэлыя пяць хвілін. На месцы, якое яшчэ ўчора явілася нам як цыганскі табар, выстойвалі адно рабочыя з заклапочанымі тварамі.

У клімат цыганскага сонца мы трапілі дзякуючы СМІ. Вось у вужакаватай чарзе „таксі” мы прыкмецілі нашага „добрага пана”. Ён таксама нас звочыў, хоць замест падаць „добры дзень”, засланіўся газетай.

„Стрэл проста ў голаў!” — крычаў загаловак на першай старонцы гуменскай штодзёнкі.

*(працяг будзе)*

**Ева Сцепанюк**

# *Мілейчыцкі турызм*

На тэрыторыі Мілейчыцкай гміны няма выдатных прыродных і ландшафтных каштоўнасцей. Краявід тут плоскі і манатонны. У гміне мнагавата лясоў на колішніх сельскагаспадарчых угоддзях, асабліва на ўсходзе і поўдні. Разнастайнасць у гмінны краявід уносіць даліна ракі Нурчык, якая цячэ праз лугі і балоты з комплексамі рыбных ставоў. Вялікую вартасць мае зладжаны вясковы культурны краявід з мазаікай палёў, лясоў і лугоў з выдатна да гэтага ландшафта дапасаванай драўлянай забудовай вёсак. Найцікавейшай мясцовасцю з'яўляюцца Мілейчычы з комплексам помнікаў. Камунікацыйная даступнасць гміны добрая, бо перасякаюць яе шаша з Сямятыч у Гайнаўку і чыгуначная лінія Чаромха — Седльцы. Найбольш перспектыўнымі формамі турызму ў гміне трэба палічыць агратурызм і культурны турызм.

Да найважнейшых помнікаў у гміне трэба залічыць культавыя аб'екты: драўляны касцёл (з 1650 года), дзве драўляныя царквы (1820 і 1900) і сінагогу (1927) у Мілейчычах і драўляныя цэрквы ў Сабятыне (1672) і Рагачах (1872) з цудоўнай іконай св. Антонія Пячэрскага.

Да культурных і турыстычных каштоўнасцей Мілейчыцкай гміны трэба таксама залічыць запаведную урбаністычную расстаноўку і драўляную маламестачковую забудову Мілейчыч, каштоўныя прасторавыя планіроўкі і драўляную забудову вёсак, асабліва ў Сабятыне, Мікулічах, Рагачах, Мядзвежыках і Бялках ды рэшткі дворскага комплексу з паркам у Паканеве.

У межах гміны няма запаведнікаў ні іншых ахоўваемых абшараў. Гастраномія засяроджваецца выключна ў адным бары ў Мілейчычах. Няма начлежнай базы і турмаршрутаў, адсутнічае турыстычная інфармацыя.

**Міхал Мінцэвіч**

# *Як памерламу кадзіла*

Здзіўляе мяне („Ніва” № 32), каму людзі, якія ідуць на Святую Гару Грабарку на свята Іаана Хрысціцеля і ў Пяценку, пакланяюцца — Богу ці нячыстай сіле — калі ім у галаве нейкія зёлкі. Быццам тыя зёлкі сілай нейкай магіі засцерагаюць ад злога... А слова „магія” гаворыць само за сябе, што яно не Божае, а д'ябальскае. Людзі спрадвечна шчыра верaць у забабоны, чарадзейства і вядзьмарства, а жывы Бог далёка ад іх і мала верaць у Яго. А шкада, бо яны наконт забабонаў павінны пашукаць нейкае карыснае і павучальнае слова ў Бібліі: ці варта карыстацца гэтымі зёлкамі і ці яны пажаданыя Богам. Адно ведаю: што шаптуны, чарадзеі і ведзьмары не наследуюць Царства Божага. У гэтыя цёмныя сілы я цалкам не веру!

**Мікалай Панфілюк**

# *Паслядоўнасці бежанства*

У сувязі з цікавай размовай Аляксея Мароза з Дарафеем Фіёнікам „Трагедыя нашых людзей” („Ніва” № 33) хочацца мне звярнуць увагу на адну вельмі важную паслядоўнасць бежанства, з якой даследчыкі пэўна сустракаюцца ў час вывучэння тэмы шляхам размоў з жыхарамі вёсак. Менавіта ў выніку паскоранага памірання старэйшага пакалення і страшэннага стамлення адбудовай гаспадарак людзей сталага ўзросту і тадышняй моладзі поўнасцю адышлі ў нябыт спрaвы даваеннага перыяду. Стабільнае і наогул матэрыяльна забяспечанае жыццё падляшскай вёскі ў II палове XIX стагоддзя і ў першых пятнаццаці гадах XX стагоддзя садзейнічала развіццю народнай культуры, асветы і рэлігіі. Шок, якім у грамадскім адчуванні аказалася бежанства, думкі і высілкі пацярпеўшага народу засяродзіліся на матэрыяльных справах — на здабыванню хлеба, адбудове гаспадарак. Іх духовая спадчына, якая да гэтай пары перадавалася з пакалення ў пакаленне, даволі хутка патанула ў бездані поўнага забыцця.

Сёння ў многіх вёсках цяжка знайсці чалавека, які мог бы расказаць пра мінулае гэтай мясцовасці да першай сусветнай вайны. На прыклад, у Тэлятычах Нурэцкай гміны ніхто не ведае, у якім месцы калісьці стаяла царква. Усе ведаюць, што ў іншым месцы, чым цяпер, але дзе — невядома.

Падобная сітуацыя і ў маіх Бацікках-Задніх (Сямятыцкая гміна). Тут ніхто са старажылаў не памятае, што ў пачатку XX стагоддзя ў вёсцы жыла і прымала шматлікіх пацыентаў вядомая тады бабка-лекарка Трафіміха, якой славу можна параўнаць з сённяшняй славай знахарак з Орлі. Тым часам у суседніх каталіцкіх шляхецкіх вёсках, жыхары якіх у бежанстве не былі, сёння можна распытацца пра многія падзеі і справы з глыбокай даўніны.

Нельга нам забываць аб спусташэннях у калектыўнай памяці, калі абмяркоўваем разнародныя паслядоўнасці бежанства.

**М. Ц.**

зорка
для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# Канцэрт свабоды



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

**— З беларускага ліцэя прыехаў поўны аўтобус, — кажа хлопец з Бельска-Падляшскага. — Мы самі арганізавалі паездку, заплацілі за дарогу. Не маглі мы праваронiць такой падзеі...**

Праўда, сярод шматлюднай публікі цяжка было прыкмеціць сяброў з глыбінкі, усе фаны беларускага рока выглядаюць як вялікая сямейка „Басовішча”. Многія з іх адзначаюць гэтую дэталь, на канцэрт прыходзяць у фестывальных кашульках, прыносяць з сабой бел-чырвона-белыя сцягі, з якімі танчаць пад сцэнай. Вось і 9 верасня ў цэнтры Беластока (ля Драматычнага тэатра) адбыўся беларускі рок-канцэрт, на якім бліснулі зоркі з Беластока і Мінска: „0-85”, „IQ-48”, „Уліс”, „Н.Р.М.”.

— Я прыйшла для „Н.Р.М.”, — кажа гімназістка Аня, — бо яны ёсць *куль!*. Аня была ўжо на „Басовішчы” і там купіла дыскі беларускіх рок-гуртоў, зараз знаёміцца са словамі песень.

— Мне пазванілі бацькі і сказалі, што ўвесь канцэрт чуваць у нашай кватэры на Беласточку, — дадае Бартэк, сябра Ані. — З гэтай нагоды яны выключылі нават тэлевізар.

„Канцэрт свабоды” наладзілі Мададыя дэмакраты, у ролі канферансье запрэзентаваліся Аня Мойсак і вядомы з тэлепраграмы „Ідал” Роберт Ляшчынскі. Беласток шалеў да адзінаццатай гадзіны ночы!

**Зорка**



*Данель Каліноўскі*



*Аляксандра Семянюк і Сільвія Флярчук*



*Дарэк Шафран*

# Закароткія канікулы дзяцей з бельскай „тройкі”

**Данель Каліноўскі — вучань III класа**

Канікулы прайшлі захутка! Я ўжо на самым пачатку паехаў да сваёй бабулі, якая жыве ў вёсцы Кулыгі (недалёка ад Сямятыч). Я езджу да яе кожны год, бо нідзе няма так „супер” як у бабулі! У гэтым годзе я першы раз сам ездзіў на трактары; бацька дазволіў мне кіраваць ім, калі ўжо сабралі ўсё з поля. Ніводзін з маіх сяброў з панадворка не кіраваў яшчэ трактарам, а я — так! Апрача гэтага я памагаў бацьку пры жнівах, а нават сядзеў на камбайне! Са старэйшым братам ездзілі мы на заліў купацца, вудзіць рыбу. Але на канец то нават хацелася мне ў школу, пабачыць сяброў.

**Дарэк Шафран — вучань II класа**

Разам з малодшым братам і бацькамі мы амаль месяц былі ў Міланоўцы на Мазурах. Там мы былі таксама ў мінулым годзе. Мы часта купаліся ў возеры, лавілі рыбу, палілі вогнішчы, хадзілі у лес па грыбы, якіх амаль не было, хаця я знайшоў здаровага баравіка! Пад канец канікул мы былі ўжо ў Бельску і разам з мамай куплялі падручнікі ў школу, гулялі на камп’ютэры, хадзілі на басейн.

**Аляксандра Семянюк — вучаніца IV класа**

Канікулы прайшлі рашуча захутка! У гэтым годзе я два тыдні правяла ў лагеры на Мазурах. Там мы мелі час на заняткі, розная тыпу гульні. Плавалі мы ў возеры, удзельнічалі ў шматлікіх конкурсах. Вечарамі палілі вогнішчы, елі печаную бульбу, каўбаскі, а нават мелі „зялёную” ноч і ноч страхаў! Пасля лагера я з малодшай сястрой Веранікай часта ездзіла да бабулі Ані ў Відава, а там з сяброўкай Сільвяй Флярчук, якая таксама вучыцца ў чацвёртым класе ў нашай школе, я гуляла ў „гуму”, займалася на камп’ютэры. Калі ў бацькі быў вольны час, мы ездзілі на рэчку, дзе я вучылася плаваць, загарала на сонцы. Аднак хацелася мне ўжо ў школу, пабачыць сяброўак і зноў хадзіць на англійскую мову, бо на час канікул я мела вольнае! А ў гэтым годзе я пачну вучыцца нават рускай мове!

*Тэкст і фота*
*Паўліны Шафран-Асташэвіч*

# Шантажыст з V класа

Максім, так мяркуюць яго знаёмыя, заўсёды займаўся шантажом. Ужо ў садку заахвочваў сябровак маляваць у яго сшытку, а пасля патрабаваў у іх грошай:

— Ты ж зашмаравала ўсе лісты!

Дзяўчынкі плакалі. На другі дзень прыносілі яму грошы або новы сшытак. Такім чынам наш жулік меў пад дастаткам паперы для малявання. Але тады, як усе згодна адзначаюць, не было яшчэ вялікай бяды.

Праблемы выявіліся пад канец пятага класа, калі ў класе пачаліся раманы. Максім, як заўсёды, карыстаўся заслужанай славай. Карацей, усе сяброўкі балдзелі ад яго салодкай усмешкі і ямачак на шчоках. Кожнае яго слова ўспрымалі як загад.

— Пабрый ногі, а то як той *гобіт* выглядаеш, — параіў ён Магдзе, якая ад захаплення не магла адарваць ад Максіма вачэй.

Пад уплывам жорсткай увагі дзяўчынка пачала займацца дэпіляцыяй валосся, ды не толькі на нагах, — зараз яна абстрыжаная як скінка. Усе падсмейваюцца з дурніцы Мадзі, найгаласней — Максім. Распавядае пра яе сваім новым сімпатыям: „Яна, — кажа пра закаханую аднакласніцу, — у салдаты збіраецца!”

Дзяўчаты любяць такія плётачкі, кайфуюць. Асабліва тыя, што закаханыя ў нашага Максіма.

Усё мае, аднак, свае межы.

— Ведаеце, што пра нашу Магду пішуць ва ўсёй Польшчы?! — заявіў аднойчы класу абураны выхавацель. — Калі не верыце, — цягнуў ён, — загляньце „на аську” (сайт *gadu-gadu*).

Калі на перапынку сябры дарваліся да камп’ютэра — у іх пазелянела ў вачах. Інтэрнаўты, старыя і малыя, усе як адзін пляткавалі пра „лысую і прынца”.

Хоць ніхто ў класе ўголас не гаварыў пра аўтара таксічнага ньюса, усе дадумаліся, хто стаіць за самалюбнай мянушкай „прынц”. Між іншымі дамагаўся ён ад „лысай”, каб тая дапамагла яму наладзіць сустрэчу з Сарай, сваёй малодшай сястрой. Інакш, — пагражае „лысай” наш „прынц”, — *распавяду ўсім, што мы рабілі 14 лютага 2005 года!* (як падказалі нам вавёркі — у дзень Валянцінак, „лысая” і „прынц” самі падпісалі сабе па дзесяць „валянцінак” і падкінулі іх у агульную скрынку на школьным калідоры).

Праўда, у класе з ходу дэтранізавалі нашага „прынца” ды зводна празвалі яго „шантажыстам”. І зараз, калі сустрэнеце „на асьцы” перабольшаныя гісторыі, пад якімі падпісваецца нейкі „прынц” і распавядае пра свае каханні — не верце! Трэба вам ведаць, што зараз наш „донжуан”, як адзіны ў класе, не мае дзяўчыны.

**Зорка**

# Курапаткі

*Самка **курапаткі шэрай** у шлюбны перыяд пераклікаецца частым „піт-піт-піт”, самец азываецца „кіер-рэк”. Курапаткі шэрыя — з сям’і фазанавых, атрада курападобных. Аселая і наземная птушка. Вонкава і звычкамі прыгадвае хатніх курэй — хутка бегае, грабецца ў пяску. Важыць да 460 грамаў, даўжыня цела да 34 см. Апярэнне шэрае, са светлымі падоўжнымі стракацінкамі на крылах і папярочнымі буравaтымі на баках. На брушку цёмна-каштанавая пляма-„падкова”, у самак меншая або яе няма. Лятае хутка і шумна. Гняздо робіць у ямцы на зямлі ў траве, пад кустамі. Нясе да 24 шаравата-аліўкавых яек ад другой паловы красавіка да ліпеня, выседжвае іх да 24 сутак. Летам знайсці можна курапатак на палях з жытам, лубінам, бульбай, канюшынай, восенню — на лугах сярод вербалозу і трыснягу. Трапляецца на ўзлесках, тарфяніках, сухіх лугах. Корміцца раслінамі, насеннем, насякомымі; асабліва ахвотна ласуецца каларадскім жуком („стонкай”). Зімой у пошуках корму ходзіць па дарогах, каля жывёлагадоўчых памяшканняў і ў вёсках. Бачыла я шмат чародак шэрых курапатак зімой пад новымі мікрараёнамі гарадоў. Паколькі курапатак няшмат, нельга на іх паляваць. Вядуцца доследы па штучнаму развядзенню курапатак. Прабавалі таксама акліматызаваць (няўдала) **курапатку барадатую** (сям’я фазанавых, атрад курападобных), якая ад курапаткі шэрай адрозніваецца „барадой”, больш доўгім пер’ем пад дзюбай, вохрыста-жаўтаватым налётам на пер’і і чорнай плямай на брушку. Яшчэ больш рэдкі від — **курапатка белая**, занесеная ў Чырвоную кнігу, птушка з сям’і цецеруковых атрада курападобных. Апынулася яна пад пагрозай знікнення. Жыве на высокіх балотах з нізкай хвояй і бярозай. У зімовых чародках збіраецца да 6 асобін. Корміцца пупышкамі і парасткамі вярбы, бярозы, асіны. Апярэнне зімой у яе белае з чорным хвастом, летам рыжа-бурае, у самак мяняецца яно 3 разы ў год, у самцоў — 4 разы. Самец гучна крычыць „кэррр-эрр-эр-эррр”, пасля ціха „кібэу-кібэу”. Гнёзды робіць на махавых купінах, кладзе звычайна да 9 яек. І яна — невялікая „курачка” даўжынёю да 34 см ды вагой да 870 грамаў.*

**Міра Лукша**



Фота Ганны Кандрацюк

Співаюць дзяўчаты з ПШ № 2 у Гайнаўцы



Фота Паўліны Шафран-Асташэвіч

Пачатак навучальнага года ў ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім

## Вершы Віктара Шведа

### У Дзень Нараджэння

*Мінуў чарговы дзень ізноў,*
*зноў свята ў нашай хаце.*
*Пятнаццаць стукнула гадоў*
*Нашай дачусі Наце.*

*З кожным годам больш турбот*
*І працы штораз болей*
*І вымагае кожны год*
*Заняткаў болей у школе.*

*І таму трэба кожны дзень*
*Вучыцца і вучыцца,*
*Ляноты знікнуў каб і цень,*
*Каб усім марам збыцца.*

*З навукай быць — як у баю,*
*Сістэмна, акуратна.*
*І каб Гімназію сваю*
*Закончыць на выдатна.*

*Дык многа працаваць*
*Каб з дапамогай Боскай*
*Пасведчанне зноў атрымаць*
*З чырвонаю палоскай.*

*На цяжкасці ўсе ў Барацьбе*
*Каб вытрымкі хапіла,*
*Хачу я пажадаць Табе*
*Здароўя шмат і сілы!*

*Беласток, 15 верасня 2005 г.*

## Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.





Адказ на крыжаванку № 34: Купэ, тур, верас, перапёлка, час, аснова, брама, бар. Вечар, мера, раса, этап, усё, ар, Об, кава, ганарар.

## Бульба

*Расла бульба вясной, летам,*
*Зелянела на палетках,*
*Восенню зусім даспела,*
*Яе лісце парудзела.*
*Палягалі ёй галіны*
*На чарнозем і на гліну,*
*А заглянуць ёй пад спод —*
*На карэнні вісіць плод:*
*Шэрых бульбінаў багата.*
*На капанне будзе свята:*
*Усе бульбіны сабраць,*
*Мяшкі моцна завязаць,*
*У склепы звезці, захаваць,*
*Пасля бульбу гатаваць:*
*Бульбу зварым, бульбу зжарым,*
*Добра скварачкай засквварым,*
*У таўканічку кропу ўкінем...*
*Мейшы бульбу, не загінем!*

**Міра Лукша**

*Ф. Варашыльскі: У мяне ёсць свая, можна сказаць галівудская, версія роду Варашыльскіх. Мяркую, што мая сям'я выводзіцца з вёскі Варашылы на Беласточчыне, якая існуе да сённяшняга дня...*

# Шматкультурны еўрапеец

**Размова з Феліксам ВАРАШЫЛЬСКІМ — калекцыянерам старых паштовак з відамі Гродна. Ён — ураджэнец Шчэціна з гродзенскімі каранямі. Цяпер жыве ў Гамбургу, дзе працуе кардыёлагам.**

***— Што схіліла Вас пачаць збіраць паштоўкі з выявамі старога Гродна?***

— Гродна — горад, з якога выводзіцца сама меней тры пакаленні маёй сям'і. Мне цікава было ведаць як выглядала Гродна тады, калі жылі ў ім мой бацька, дзед і прадзед. Але ў мяне не было спецыяльнай ідэі як задаволіць сваю цікавасць. Нехта падказаў мне, што найлепшым спосабам будзе калекцыянаванне старых паштовак з выявамі колішняга горада. Пачаткова мне здавалася, што гэта лёгкае і таннае хобі, але аказалася яно даволі цяжкім і дарагім. Раптам пайшла мода на старыя паштоўкі, павялічыўся лік калекцыянераў. Часам цяжка купіць старыя адкрыткі, а рэдкія экземпляры шмат каштуюць.



Фота ПАТРЫЦЫІ КОС

***— Ваша хобі цесна звязана з гісторыяй Вашай сям'і...***

— Няшмат дакументаў захавалася з мінулага маіх продкаў, але ў мяне ёсць свая, можна сказаць галівудская, версія роду Варашыльскіх. Мяркую, што мая сям'я выводзіцца з вёскі Варашылы на Беласточчыне, якая існуе да сённяшняга дня. А можа гэта назва вёскі ўтварылася ад прозвішча маіх прашчураў? Гэта настолькі праўдападобная версія, што чарговыя сляды, доказы на яе пацвярджэнне знаходзіў я ўздоўж чыгуначнай лініі Беласток — Гродна: у Трырэчках, Дуброве-Беластоцкай і ў самім Гродне.

***— Калі Вы сталі збіраць паштоўкі?***

— Восем гадоў таму, на зломе 1996/1997 гадоў. Першыя паштоўкі купіў я пяць мінут пасля прыняцця рашэння аб калекцыянаванні Гродна на старых паштоўках. Тады былі яны вельмі танныя.

***— А якія канкрэтна паштоўкі Вы збіраеце?***

— Мяне цікавяць паштоўкі выдадзеныя да 1945 года, да канца II сусветнай вайны. Прытым трэба сказаць, што ў час вайны паштоўкі амаль не выдаваліся. Існуюць адна ці дзве серыі, выдадзеныя нямецкімі акупантамі. Зараз у мяне каля 1 200 паштовак. Стараюся збіраць цэлыя выдавецкія серыі. Калісь аўтарскія правы не ахоўваліся законам і некаторыя матывы паўтараюцца ў розных выдаўцоў. Многа паштовак не мае памечаных выдаўцоў, сустракаюцца таксама прыватныя серыі, калі нехта заказваў у фатографа, напрыклад, 10 здымкаў у форме адкрытак і высылаў іх знаёмым. Гэтыя паштоўкі, часам з вельмі цікавымі матывамі, найдаражэйшыя. Дарэчы, аднаго цэнніка на паштоўкі не існуе. Калі паявіцца вельмі рэдкі экземпляр і, дапусцім, трох калекцыянераў стане за яго змагацца, тады цана можа дайсці да некалькіх соцень долараў. Цяпер паштоўкі галоўным чынам прадаюцца на інтэрнэтных аўкцыёнах і калекцыянерскіх біржах.

***— А дзе паказваеце калекцыю?***

— Да гэтай пары адбыліся дзве выстаўкі — на Шлёнску і ў Гродне. Апошняя якраз заканчвае сваю працу. Першая выстаўка атрымалася зусім выпадкова. Сустрэў я сімпатычнага ўладальніка галерэі, які сам запрапанаваў мне выстаўку. Экспазіцыю ўдалося сарганізаваць вельмі хутка. Сваю багатую калекцыю хачу прэзентаваць шырокай публіцы, але сам яшчэ не ведаю, дзе адбудзецца чарговая выстава.

***— Ваша калекцыя багатая. Ці не думалі Вы ўстанавіць рэкорд для кнігі Гінеса?***

— Хай рэкорды ўстанаўліваюць тыя, што праглынаюць каўбасу на час. Маё збіранне ў апошнім часе крыху супакоілася. Шукаю паштовак невядомых мне па матывах, месцы выдання і тэхніцы. Існуюць дзве паштоўкі, пра якія ведаю і якія хачу набыць. Астатнія, веру ў гэта, знойдуцца самі.

***— Ці належыце да арганізацыі, якая гуртуе калекцыянераў?***

— І так, і не. Існуе нефармальнае таварыства, якога заснавальнікамі былі мы разам з Тамашом Вісьнеўскім і Аляксандрам Сасной. Называецца яно „Шукаем Польшчы". Наша мэта — шукаць польскія краявіды, тую даўнюю Польшчу, якая існавала дзесяцігоддзямі таму, многанацыянальную, шматкультурную, рэлігійную (без нацыяналістычных акцэнтаў).

***— Часта бываеце ў Гродне?***

— Так, у Гродна езджу ўжо шэсць гадоў і да таго сістэматычна, сама меней раз у год. Сёлета буду ў Гродне двойчы: першы раз, калі вазіў паштоўкі на выставу ў Замку; а цяпер паеду другі раз, каб забраць іх назад.

***— Размаўляеце на беларускай мове?***

— Беларускую мову разумею, аднак гаварыць на ёй не ўмею. Добра ведаю рускую мову. Маёй роднай мовай з'яўляецца польская, але цяпер часта карыстаюся нямецкай.

***— А як Вы трапілі ў Гамбург?***

— У Нямеччыну я выехаў 25 гадоў таму. Спачатку на некалькі тыдняў у Берлін, каб падзарабіць. Але гэтая паездка зацягнулася і ў Берліне правёў я 10 гадоў. Аднак сталіца стала мяне стамляць і я пераехаў у больш спакойны Гамбург. Жыву я ўжо тут 15 гадоў і вельмі мне Гамбург падабаецца.

***— Кім Вы сябе адчуваеце: палякам, немцам, а можа беларусам?***

— Адчуваю сябе чалавекам, які нарадзіўся ў Польшчы, у якога гродзенскія карані і які цяпер жыве ў Нямеччыне. Карацей кажучы, адчуваю сябе еўрапейцам, сувязным паміж некалькімі культурамі.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыла Патрыцыя Кос**

# Толькі пяць дзён у Гайнаўцы

– 1 –

**На станцыі Высока-Літоўск з усмешкамі палічылі мы грошы, завушніцы і іншыя каштоўныя рэчы, уважліва запоўнілі дэкларацыі. Дэлегацыя прадстаўнікоў Беларусі ад'язджала ў Польшчу. Праз якія паўгадзіны — наш першы прыпынак за мяжой — Чаромха. Адтуль у суправаджэнні рэферэнта-арганізатара праекта Наталлі Герасімюк рушылі мы ў Гайнаўку.**

Мне, студэнцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, выпала магчымасць паехаць за межы Беларусі ў час летняй практыкі. Адны едуць за граніцу, каб наведаць супермаркеты, купіць тое-сёе на распродажах, другія — пазнаёміцца са славутасцямі іншай краіны, або змяніць правінцыяльныя краявіды на загранічныя. А наша невялічкая дэлегацыя Камянеччыны ехала ў Польшчу на навукова-практычны семінар, прысвечаны фальклору Беласточчыны.

***Польшча вітае***

З цікавасцю ўглядалася я ў краявіды: вёскі здзіўлялі нязвыклай прыгажосцю і ўрачыстасцю. У дварах — дэкаратыўныя дрэвы, блакітныя елкі; ні агародаў з бясконцымі градамі, ні жывёлы на прывязі нідзе я не заўважыла. З балконаў аж да зямлі звісалі яркія кветкі. Неўзабаве ўвагу прыцягнулі масіўныя купалы, у якіх зіхацела сонца. Нязвыклая канструкцыя збудавання не магла не здзівіць. Аказалася, мы ўжо ў Гайнаўцы. Самым першым нас маўкліва вітаў праваслаўны сабор св. Тройцы. Яшчэ колькі хвілін і мы апынуліся ў палоне невялікіх шматпавярховых дамоў, блакітных вітрын магазінаў, а стракатая рэклама на кожным кроку запрашала што-небудзь купіць.



Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

У Гайнаўцы нас сустрэў Ян Карпюк — дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры. Ён заўважыў, што гэтая сустрэча — толькі першыя крокі ў сумесным польска-беларускім праекце „Забытых таямніцаў чары", вынікам якога павінна стаць кніга. На сустрэчу запрасілі дырэктараў школ, настаўнікаў, метадыстаў як з Беларусі, так і з Польшчы, якія маюць магчымасць максімальна арганізаваць збор матэрыялу на месцах сваёй працы. У праграме паездка і на беларускую старану, каб завітаць да дзяцей у школы, зацікавіць іх у супрацоўніцтве. Тых дзяцей, чый матэрыял будзе лепшы, гайнавяне запросяць да сябе ў госці. Праект фінансуецца фондам Еўрапейскага Саюза і разлічаны на 12 месяцаў (гэта значыць, наступным летам павінна быць выдадзена важкая кніга на дзвюх мовах).

**Марына Бурко**

*Найбольшае зборышча яўрэйскіх дамоў і плошчаў знаходзілася навокал двух галоўных рынкаў мястэчка, а таксама ўздоўж яго галоўнай вуліцы Бельскай...*

# Яўрэі ў Боцьках

**Яўрэі да вайны жылі ў Боцьках, так як пэўна ж і ў кожным з нашых мястэчак. Паводле даследчыка Тамаша Віснеўскага, пасяліліся яны тут ужо ў 1577 г., а можа і яшчэ раней.**

Год пазней у Боцьках з'явілася невялічкая гміна яўрэяў. Згодна перапісу ад 1676 г., на 318 жыхароў гэтага даўняга мястэчка былі тут тады ўсяго 44 яўрэі. У 1716 г. у Боцьках (у мясцовай падляшскай гаворцы — Ботьках, яўрэйскія варыянты — Бодкі, Ботскі) на 400 жыхароў мястэчка было ўжо 96 яўрэяў. У 1750 г. Боцькаўскі прыкагал налічваў 56 яўрэяў, а ў саміх Боцьках жыў у той час 151 яўрэй. Пятнаццаць гадоў пазней у Боцькаўскім кагале жыло ўжо 855 паслядоўнікаў Майсеевай рэлігіі, з гэтага ліку 330 у самім мястэчку. Паводле прускага перапісу ад 1799 г., у Боцьках жыло 616 яўрэяў, а першага царскага ад 1807 г. — 605. З гэтага часу Боцькаўская бажнічая акруга хутка павялічвалася і ў 1847 г. налічвала ўжо 2 567 яўрэяў. У самім мястэчку ў 1860 г. жыло 743, а ў 1878 — 1 264 яўрэяў. Паводле перапісу ад 1897 г., на 2 636 жыхароў мястэчка жыло ў ім 1 409 вернікаў Старога запавету. Першы перапіс даваеннай Польшчы ад 1921 г. налічыў у Боцьках 723 яўрэяў. У 1942 г. жыло тут 755 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці.

Найбольшае зборышча яўрэйскіх дамоў і плошчаў знаходзілася навокал двух галоўных рынкаў мястэчка, а таксама ўздоўж яго галоўнай вуліцы Бельскай. Яўрэі жылі гэтаксама на Дубенскай, Браньскай і Залонскай вуліцах. Галоўны яўрэйскі раён мястэчка знаходзіўся ў ягонай сярэдне-заходняй частцы паміж праваслаўнай царквой і каталіцкім касцёлам. Тут гэтаксама, бліжэй касцёла, знаходзіліся нядзеючыя ўжо перад вайной старыя яўрэйскія могілкі. Другія, заснаваныя ў 1884 г., яўрэйскія могілкі знаходзіліся ў паўднёвай частцы мястэчка за рэчкай Нурэц па дарозе ў Далубова. Над рэчкай да нашых часоў збераглася старая цагляна-каменная яўрэйская лазня з XVIII ст. У канцы XVII ст. у Боцьках узнікла першая сінагога. Перад вайной існавала ў іх гэтаксама другая, галоўная муравaная сінагога, каля якой знаходзіўся драўляны дом малітвы і дом рабіна. Абедзве бажніцы былі знішчаны падчас другой сусветнай вайны.



*Неіснуючыя ўжо галоўная сінагога і драўляны дом малітвы ў Боцьках*



*Неіснуючая ўжо драўляная бажніца ў Боцьках*

Галоўная двухпавярховая сінагога знаходзілася ў заходняй частцы мястэчка недалёка вул. Залонскай (цяпер Антаняка) і Дубенскай. Узнікла яна ў 1807 г.

У бакавой прыбудове захоўвалася Тора з 1768 г. і з 1740 г. сярэбраныя бляшанкі на ахвяраванні. Каля пятнаццаці метраў ад галоўнай бажніцы стаяў драўляны будынак яўрэйскай школы, пабудаваны ў 1896/1897 гг. II сусветная вайна дапоўніла долю боцькаўскіх яўрэяў. Пасля яе заканчэння шматвяковы боцькаўскі яўрэйскі свет перастаў існаваць. Нават пра гэтыя факты не ведае ўжо сёння ні боцькаўская ці наогул падляшская моладзь. Часам з'яўляюцца яны ў апавяданнях старэйшых людзей, у тым ліку і маёй маці. Для маладога пакалення гэты некалі рэальны свет гучыць ужо як быццам бы нейкая экзотыка. Яўрэйская нацыянальная меншасць, так характэрная шматлікім раёнам іншых краін, у нашым наваколлі практычна перастала існаваць.

**д-р Юрый Трачук**
**Каталіцкі люблінскі універсітэт**

## Кіркут у Нараўцы

Кіркут — яўрэйскія могілкі — у Нараўцы заснавалі ў XIX стагоддзі. Яўрэі пасяліліся тут на пераломе XVIII і XIX стагоддзяў. У 1880 годзе ў Нараўцы пражывала 778 яўрэяў, а ў 1897 годзе — 1 004. У канцы XIX стагоддзя яўрэі пачалі выязджаць з Нараўкі, між іншым у Гайнаўку, якая тады хутка развівалася. Перад другой сусветнай вайной Нараўка налічвала тысячу жыхароў, у тым ліку палову насельніцтва складалі яўрэі.

Нараўчанскія яўрэйскі могілкі займаюць каля паўтарагектаровую плошчу. Яны знаходзяцца на лясістым узгорку за Нараўкай пры дарозе ў Альхоўку і Масева. Да вайны тут хавалі таксама яўрэяў з Шарашова, Свіслачы, Белавежы і Гайнаўкі.

Да нашага часу захавалася каля 300 намагільных плітаў (мацэваў) з пясчаніку, польнага граніту, бетону, з надпісамі на яўрэйскай мове. Надпісы на плітах канчаюцца сказам: „Няхай душа яго астанецца завязаная ў мяшочку жыцця". На плітах сустракаюцца выявы зоркі Давіда, кветкавых матываў, а таксама рысункі далоні, зламанага дрэва або свечкі.

Студэнтка, якая вывучае стараяўрэйскую мову, расшыфравала некаторыя прозвішчы на намагільных плітах, м.інш.: Мэндэль, Каплонскі, Шапіро, Малэцкі, Эдэльман, Хая, Ціхавольскі, Рубэнштэйн. На некаторых магілах няма плітаў, а толькі ляжаць роўна пакладзеныя невялікія камяні.

Дзесяць гадоў таму за частковае добраўпарадкаванне нараўчанскага кіркута ўзяліся юныя добраахвотнікі з Нараўкі, м.інш. Кацярына Бяляўская, Войцех Пацэвіч, Рафал Алесінскі і Марцін Панкоўскі.

Наведаў я кіркут 5 верасня г.г. Ён не абгароджаны (колішні мураваны паркан разваліўся), запушчаны. Многа плітаў паваленых, прысыпаных пяском. Ніхто не клапоціцца пра іх. Яны, здалося мне, бездапаможна нема крычаць выразанымі ў камені надпісамі

**(мох)**

# У бок класіцызму



*„Памяць, гаварыˮ — такі загаловак даў кнізе сваіх успамінаў выдатны пісьменнік Уладзімір Набокаў. Ідучы за яго прыкладам нахіляюся, вось, над тхланню веку, страшнага і прыгожага заадно, які, здавалася б, толькі што беспаваротна прамінуў, а які паглынуў, мабыць, большую частку майго жыцця. Спыняюся, каб запытацца, каб у запытанні знерухомець. Што кажа мне вобраз рова на адпадкі, тамака, на падгарадскім могільніку; кідалі туды старыя вянкі і стужкі, прывялае квецце, лістоту і цяні. На беразе таго рова цягнуўся рад безымянных магіл, копчыкаў зямлі, непазначаных, без табліц, крыжоў. Паколькі былі гэта магілы самагубцаў, а ў тую эпоху, эпоху мае chmurnej, górnej i durnej маладосці, самагубства лічылася адным з найбольшых, найгалоўных грахоў і хрысціянскія цэрквы адмаўлялі самагубцам права на звычайныя, чалавечныя паховіны ў пасвячонай зямлі.*

*Сёння стараюся зразумець тагачасныя забароны і загады, якія падтрымлівала хрысціянская ідэя. І ведаю, што кожны з нас, тут, на зямлі, тут, пад небам, павінен, а можа і мусіць, заняць пазіцыю ці адабрэння, ці адмаўлення жыцця-быцця; павінен заняць пазіцыю наконт таго, што ў нашым жыцці, а далей у нашай грамадскасці, у нашай дзяржаве трэба змяніць, а што прыняць за сваё. Я захапляюся спакоем хрысціянства, калі навучае яно, як пераносіць усялякія нягоды, як ухіліцца ад усёабдымнага, татальнага асуджэння, нігілізму. Самагубства было б, значыць, благім выхадам, памылкай экзістэнцыі, уцёкамі ад цяжкога выбару. Таму што Бог уступіў мне, табе, чалавеку, частку сваё мудрасці і свабоды.*

*А калі прамаўляе памяць, бачу тую эпоху мае маладосці, калі запанавала нада мною гожая хвароба, калі вырашыў я ўсур'ёз заняцца мастацтвам, літаратурай, пісьменніцтвам. І ў пошуках вядучай ідэі натрапіў я на плынь экзістэнцыялізму ў літаратуры, якія якраз стаў модным, ды, што за гэтым ідзе, прамінаючым, а затым — плыткім. А быў гэта час палітычнай адлігі, калі зваліліся кайданы сталінізму і ў культуры краіны над Віслай выбухла разнароднасць стыляў, напрамкаў ды пошукаў. Здабыткі экзістэнцыялізму я і падобныя мне індывіды ўспрымалі як літаратурныя творы такога хоць бы Сартра, Камю, Бекета ці Фолкнера, бо пакуль не хапала доступу да арыгінальных твораў хоць бы Ніцшэ, Ясперса ці Хайдэгера. На маіх вачах распадаўся ў пыл афіцыйны марксізм, а мы яго трактавалі як элемент сістэмы памылак ды скажэнняў, прымітыўнага сацрэалізму, трывіяльнай, спрошчанай увы свету.*

*Не можам аднак самі сабе маніць. Якраз пад рукой Сталіна ажыццяўляўся, трыумфаваў адзіны камунізм, які кіруючыя эліты трактавалі ўсур'ёз. Пасля смерці правадыра пралетарыяту ставіліся ледзь тэатр, батлейка, блазенства. Так, рэжым рабіў злачынствы, сягаў да генацыду, так, пакутавалі бязвінныя людзі, так, была гэта паліцэйская дзяржава. Усе гэта ведалі. Але быў гэта час змагання, працы, пафасу. Так, гэта быў час спрошчаной увы свету, чорна-белай, маніхейскай, дзе адзінка значыла нішто, унушалі ў нас, што прыгнечана яна структурамі ад яе больш магутнымі, класавымі, эканамічнымі, якія яе дэтэрмінуюць ды знявольваюць. І гэтак мела быць да канца нашых дзён. Калі пасля было аб'яўлена, ну хто там, Хрушчоў, хто яшчэ, Салжаніцын (а раней Герлінг-Грудзінскі, ды ніхто яго не хацеў слухаць), што гэта нядобра, што негуманна, што не гэтак мела быць. Жартавалі лепш інфармаваныя людкове, што аптымісты-сталінцыператварыліся, сталі раптам панурымі экзістэнцыялістамі.*

*Аднак жа ж экзістэнцыялізм маёй маладосці як першы ў гісторыі прынёс паглыбленае апісанне чалавека, пазбягаючае спрашчэнняў, несхематычнае і жывое, не вагаючаея паказаць цені, дробязнасць, самоту і іншыя няшчасці, у якія багаты людскі быт. Ды вось праз некалькі ды больш за дзесятак гадоў і светаў здаецца, што тое калупанне ў чалавечых шлунках быццам перастала быць модным. Ці ж сёння быў бы героем неціярплівы, ахоплены роспаччу чалавек, сузіраючы рэальнасць у колерах адно чорным ды белым, свой — чужы. Такі, што не ўшануе ўласнае жыццё, тым больш маючы за нішто жыццё чужое. Затое ён рашучы змагар, без ніякага сумневу.*

*Ці ж не прыдатны экзістэнцыялізм пісьменніку, паколькі літаратура мае быць справай чалавечай, а не адно натхненнем да змагання ці палітычнай або грамадскай прапагандай. Альбо справай запаўнення свабоднага часу, справай малаважнай пацехі.*

*Такі экзістэнцыялізм — класіцызм, а таму такі ён чалавечны. Класіцызм у літаратуры — абарона жыцця.*

**Ежы Плютовіч**



МОВЫ СВЕТУ

# languages.miensk.com

Колькі сёння ў свеце моў, пэўна, дакладна не ведае ніхто. Таксама невядома, колькі іх знікла ў мінулым і з'явіцца ў будучыні. Але вывучэнне моў само па сабе вельмі карысны занятак не толькі з камунікацыйнага пункту гледжання. Ведаючы мову таго ці іншага народа, лягчэй зразумець ягоны светапогляд. Зразумела, усе мовы свету вывучыць наўрад ці магчыма, але даведацца аб іх існаванні не так цяжка. І ў гэтым нядрэнна дапамагае сайт http://languages.miensk.com.

Назва сайта гаворыць сама за сябе — „Мовы свету". Галоўная старонка партала выглядае даволі неардынарна. Большую частку выяўлення займае тэкст на стылізаваным пад старыя пергамент аркушы паперы, што месціцца пад назвай сайта. У тэксце аўтар і стваральнік сайта, імя якога дакладна выявіць не ўдалося, распавядае, што на гэтай старонцы мы знойдзем класіфікацыю моў Зямлі з іх кароткім апісаннем. Таму звернемся да рубрык сайта, дзе і месціцца гэтая цікавая інфармацыя. А знаходзяцца яны злева ад „пергаменту".

Для тых, хто не разумее беларускай мовы, але разумее англійскую, ёсць магчымась азнаёміцца з кароткім пераказам зместу сайта ў гэтай, пакуль найбольш распаўсюджанай у свеце, мове. Для гэтага трэба клікнуць на выйсце „English". Далейшыя рубрыкі можна назваць навінамі. Старонка „Што новага" падае такі ж самы кароткі пераказ зместу сайта па-беларуску і распавядае аб апошніх навінах ягонай працы. Трэба адзначыць, што апошняе абнаўленне там было даволі даўно — у студзені гэтага года.

Рубрыка „Моўныя навіны" абнаўляецца значна часцей. Тут можна даведацца аб апошніх падзеях, што адбыліся на планеце датычна моўных праблем.

Наступная рубрыка „Мовы Беларусі". На жаль, з усіх пададзеных там моў падрабязна распавядаецца пра ўласна беларускую і т.зв. заходнепалескую, пра якую найбольш гучна распавядалі некаторыя грамадскія дзеячы на пераломе 80-90 гадоў мінулага стагоддзя.

Даны сайт змяшчае вельмі цікавы дакумент, што быў прыняты не так даўно. А менавіта „Усеагульную дэкларацыю лінгвістычных правоў", якая была ўхвалена ў 1996 годзе ў іспанскай Барселоне. Дэкларацыя была распрацавана Міжнародным ПЭН-клубам і Міжнародным цэнтрам па правах нацыянальных меншасцей. Месціцца яна ў рубрыцы „Дакументы".

Наступныя старонкі носяць вельмі цікавы і пазнавальны характар. Каб гэта зразумець, абсалютна не трэба быць лінгвістам ці філолагам. Дастаткова папросту цікавіцца тым, на якіх мовах размаўляюць народы свету. Рубрыка „Сем'і моў" распавядае не толькі ўласна пра моўныя сем'і, але і пра так званыя макрасем'і, якіх дарэчы не так многа — каля дзесятка.

„Краіны і іх мовы" з палітычнымі картамі кантынентаў дае даведачную інфармацыю пра мовы розных краін свету. Кожная краіна выдзяляецца асобным колерам, што надае дадзенай старонцы прывабнасць. Незразумела адзінае — чаму розныімі колерамі размаляваныя штаты ў Аўстраліі, бо гэта ж адна краіна.

Калі зайсці на старонку „Алфавіты", то застанецца толькі здзівіцца той вялікай колькасці азбук, што прыдумала чалавецтва. Пры гэтым далёка не ўсе пісьмы там прадстаўлены і не ўсе са згаданых можна пабачыць на маніторы. Але і тое, што ёсць, замацоўвае ўпэўненасць, што жаданне пісаць і чытаць у чалавечай істоце жыло заўжды.

**Уладзімір Лапцэвіч**



*Перамагаць у спорце можна за кошт майстэрства альбо сілы духу. Адборавыя футбольныя матчы выразна паказалі, што ў Беларусі зараз Каманды няма...*

# Беларусь, беларусы...

### Страта твару

Аўтарытэт — гэта такая рэч, якая ствараецца гадамі па крупінках, а губляецца вельмі хутка. Тая станоўчая рэпутацыя, якую прыдбала беларуская футбольная дружына апошнім часам, была страчана цягам двух вераснёўскіх матчаў. Выезд у Малдову (0:2 для беларусаў) стаў крахам усіх турнірных шанцаў, а хатні двубой з Італіяй стратай твару. Даўно не было так сорамна за беларускі футбол. Да ўсяго перад фіяскам зборнай сінхронна выбылі з Кубка УЕФА апошнія айчынныя клубы. І калі сталічны МТЗ годна і да „апошняга патрона" змагаўся з чэшскім „Цепліцэ", то барысаўскі БАТЭ бязвольна „склаў лапкі" перад самарскім клубам з анахранічнай назвай „Крылы Саветаў". Бездапаможнасць беларускіх камандаў у змаганні з расійскімі ўжо стала ўстойлівай традыцыяй. Розніцай класу не растлумачыш такі ганебны баланс дачыненняў з усходнім суседам у еўракубках (7 паразаў у 7 спатканнях). Тут можна сцвярджаць пра ўстойлівы комплекс непаўнавартасці.

Перамагаць у спорце можна за кошт майстэрства альбо сілы духу. Працай дасягаць мэты пры спалучэнні названых якасцей. Гэтая простая аксіёма не выклікае пярэчанняў. Адборавыя футбольныя матчы выразна паказалі, што ў Беларусі зараз Каманды няма. І прычына няўдач нашай зборнай ні ў трэнерскай кваліфікацыі Анатоля Байдачнага, ні ў страце з-за траўмы бамбардыра Максіма Рамашчанкі, ні ў аб'ектыўным „спадзе" шматгадовага лідэра Валянціна Бялькевіча і ні ў зорнай хваробе „айчыннага Бэкхэма" — Аляксандра Глеба. Майстэрства па еўрапейскіх мерках у нашых футбалістаў небагата, а сілы духу, жадання біцца за гонар краіны яшчэ меней. У прэсе нават з'явіліся паведамленні, што напярэдадні важнейшых матчаў гульцы нацыянальнай дружыны весела бавілі час па барах. І калі, праваліўшы матч з Малдовай, шматгадовы капітан зборнай Сяргей Гурэнка быў адлучаны ад гульні з апенінцамі, стала зразумела, што нічога добрага чакаць не даводзіцца (бо менавіта гродзенскі выхаванец Гурэнка працяглы час быў сімвалам самаахвярнасці і баявітасці). Так і здарылася! 1:4 у безнадзейна беспрасветнай гульні з Італіяй стала адной з буйнейшых хатніх паразаў. А, здаецца, зусім нядаўна змагаліся з тымі ж італійцамі на роўных.

Прыклад, як маючы сярэднія „рэсурсы" (за выняткам суперснайпера Андрэя Шаўчэнкі, унёсак якога быў важкім, але не галоўным фактарам) можна дасягаць жаданага выніку, яскрава паказала Украіна. Яна першай у Еўропе заваявала пуцёўку на чэмпіянат свету. Пры тым заняла першае месца ў вельмі складанай групе, апярэдзіўшы моцных Турцыю, Грэцыю, Данію. Адной нагой у Нямеччыне ўжо польская дружына, якая выдала феерычную пераможную серыю. З іншых нашых суседзяў, толькі Расія, хоць і не мае добрай гульні, яшчэ мае надзею на ўдзел у фінале першынства планеты.

Моладзевая беларуская дружына таксама расчаравала. Нечакана саступіўшы малдаванам (0:1), выхаванцы Юрыя Пунтуса пасля крыху рэабілітаваліся ў матчы з Італіяй (1:1). Турнірнае становішча ў змаганні моладзевых каманд за два туры да фінішу наступнае: 1. Італія — 19 пунктаў, 2. Славенія — 12, 3. Нарвегія — 11, 4. Беларусь — 10, 5. Малдова — 8, 6. Шатландыя — 6. Шанцы ў беларусаў на другое месца, якое дазволіць прадоўжыць змаганне, яшчэ ёсць, але чамусьці ў поспех ужо не верыцца.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Перапынак*

*Задоўга да таго як самы адукаваны, з дыпломам юрыста і некалькімі вышэйшымі адукацыямі, беларускі суддзя „вырашыць", якога пакарання „заслугоўвае" той ці іншы апазіцыянер, самы тупы апазіцыянер ужо ведае, якая кара і каму канкрэтна будзе за пэўныя дзеянні. Прытым найбольш прывабным у „судовым працэсе" над апазіцыянерамі ёсць не ступень „парушэння" існага заканадаўства падсудным, а постаць таго, каму чалавек у чорнай вопратцы, дзеля якога сакратар гарлапаніць: „Встать, суд идёт!", выносіць, узгоднены па тэлефоне з кімсьці вышэйшым (зразумела, што не з Усявышнім), вельмі далёкім ад юрыдычнай кампетэнцыі, „свой" прысуд.*

*— Перадайце суддзю, хай не нервуецца і ні з кім нічога не ўзгадняе, — звярнуўся да афіцэра мясцовай міліцыі Сяржук. — Нам прысудзяць па васемсот баксаў кары ў кожным выпадку. Так што, хай зачытвае свой інквізіцыйны прысуд і не даўбае мазгоў ні сабе, ні людзям. І вам, „ахоўнікам" праваапарадку, бессэнсоўна губляць час на судах у якасці сведкаў. Вы ж у такіх справах яшчэ больш дубовыя, чым у сваіх прафесійных абавязках. Ідзіце хапаць мясцовых алкаголікаў, а то план не выканаецe.*

*— Ды вы што, хлопцы, — зычліва ўсміхнуўся афіцэр. — Якія васемсот баксаў. За што?*

*— А за што вы нас затрымалі? — падключыўся да размовы Віктар. — Мы што, арганізавалі ўзброены захоп вашага раённага цэнтра?*

*— Ды і сам не ведаю за што, — міліцыянт пачырванеў як пераварань рак. — Нам зверху загадалі вас схапіць.*

*— Ну і суддзю вашаму загадаюць. У яго таксама ёсць верх. Той самы, што і ў вас. Трэба за доўгія гады прыслужвання ўжо зразумець, што вы ўсе проста ніз.*

*Ахоўнік праваапарадку дачырванеўся да неданаранага бурака, але спрачацца не стаў. Толькі цяжка ўздыхнуў, апусціўшы вочы аж да роўно гузікаў на сваіх клінах, нібы правяраў, ці ўсё там на месцы.*

*— Встать, суд идёт!, — уратавала яго ад яшчэ больш зменаў у колеры твару нафарбаваная як шалёная малпа, якая здабыткі чалавечай цывілізацыі бачыць толькі ў маляванні кожны дзень сабе лупаў пад колер савецкага сцяга, сакратарка суда.*

*Прысутныя падняліся з крэслаў. У зал паседжанняў уварваўся збянтэжаны мясцовы суддзя. Выглядаў ён надзвычай разгублена. Як воўк, які нечакана для сваёй зграі і для сябе самога, забрахаў па-сабачаму. Яго стала нават трошкі шкада. За столькі гадоў спакойнай працы, калі даводзілася разглядаць справы з сямейнымі дэбашырамі-алкаголікамі, ці ў горшым разе са злоснымі неплацельшчыкамі аліментаў, яму падсунулі нейкіх апазіцыянераў. А што з тымі рабіць? За што судзіць? Ну, прыехалі хлопцы на магілкі, ускладі кветкі на магілу агульнапрызнанага нацыянальнага героя... Дзе тут злачынства? Але зверху... нічога не хочуць слухаць. Як глухія цецярукі на шлюбным танцы. Кажуць, што калі ў лапы роднай міліцыі патрапіла ажно два абласныя кіраўнікі апазіцыйных партый, то трэба іх караць адпаведна статусу. Адзіная надзея была на тое, што апазіцыянеры будуць паводзіць сябе па-хамску ў зале суда і можна будзе „прыкалупацца" да гэтага. Але тыя паводзілі сябе надзвычай стрымана і карэктна.*

*Суддзя абліваўся потам. Высветлілася, што пратакол складаў не той міліцыянт, які затрымліваў. Што сведкамі ёсць людзі, якіх у гэты час зусім не было ў раённым цэнтры. Праз кожныя пяць хвілінаў паседжання суддзя абвяшчаў перапынак на дзесяць хвілінаў, уцякаў у свой кабінет і доўга раіўся з кімсьці па тэлефоне. А аднога разу, калі ён змучаны працэсам, спытаўся ў сведкі-міліцыянта, як той мог усё бачыць, калі ў гэты дзень зусім не быў на службе, ледзве не самлеў ад атрыманага адказу.*

*— Што вы да мяне хочаце?! — загаласіў на суддзю міліцыянт такім голасам, якім племянны бык не можа зараўці нават пасля перапою. — Дамоўцеся там спачатку паміж сабой. Я чалавек маленькі. Што мне начальнік загадаў, тое я і гавару.*

*— Перапынак на дзесяць хвілінаў, — чарговы раз прастагнаў суддзя і кінуўся тэлефанаваць.*

*Нарэшце, стомлены як пасля першай шлюбнай ночы, чарговы раз суддзя, спатыкаючыся, прытупаў у судовую залу. Нарэшце для вынясення прысуду. Ён выцер з ілба пот, доўга ўглядаўся ў свае запісы і, як здавалася, нічога ў іх не разабраўшыся, глянуў на Сержука.*

*— Словам, вам штраф..., за парушэнне артыкулу..., у памеры...*

*— Восемсот баксаў, — смеючыся дапамог яму Сяржук.*

*— Так, — адказаў прадстаўнік судовай улады і, глянуўшы на Віктара, дадаў, — вам тое сама.*

*І куляй выскачыў з залы паседжанняў.*

*Сакратарка суда не чакала такой развязкі. Яна нічога не зразумела. Ні таго, што быў „зачытаны" прысуд, ні таго, што суд ужо закончыўся... Толькі падняла павекі так, што з іх як снег пасыпалася пудра, і яшчэ хвілінку памітусіўшыся, заявіла ўпэўненым цвёрдым голасам:*

*— Перапынак на дзесяць хвілінаў...*

*І пад усмешкі прысутных апазіцыянераў кінулася даганяць суддзю. Пакараныя таксама пасунуліся ў бок дзвярэй. На хвіліну яны затрымаліся і, убачыўшы збянтэжаных як кот, што надаў у муку, міліцыянтаў, што так і не маглі вырашыць, ісці ім ці заставацца, весела, праз слёзы, засмяяліся:*

*— Ідзіце, хлопцы, пакурыце. І не ламайце галовы над тым, каго сёння судзілі, нас, ці вас. Нас пакаралі па васемсот доляраў. А вам далі перапынак... На дзесяць хвілінаў...*

**Генрых Зладашмянскі**

# Паўз сумежжа


Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

*Царкоўка на могільніку ў вёсцы Чаромха*

**Па прафесіі ён чыгуначнік, зараз на пенсіі. Ягонае хобі — веласіпедныя вандроўкі і агратурызм. Арганізаваў агратурыстычную гаспадарку з палатачным полем. Ужо некалькі гадоў за сімвалічную залатоўку прапануе начлегі ўдзельнікам фолькавых сустрэч „З вясковага панадворка”.**

Раман Туркевіч, бо аб ім тут гаворка, вядомая ў Чаромхаўскай гміне асоба. Быў гмінным радным папярэдняга склікання, з’яўляецца намеснікам старшыні Гміннага праўлення Саюза польскіх пенсіянераў. Зараз хадайнічае за вызначэнне веласіпеднага сумежнага шляху ад Мельніка праз Чаромху ў Белавежскую пушчу праз пагранічныя вёскі — Вульку-Тэрахоўскую, Апаку-Вялікую, Белую Страж, Старыну і Тапіла.

— Разметка веласіпеднага шляху праз прыгранічныя вёскі, — гаворыць Раман Туркевіч, — дазволіць турыстам пазнаёміцца з культурай і традыцыяй жыхароў паўднёва-ўсходняга Падляшша. Шлях пралягаў бы праз наступныя вёскі: Мутная, Адамова, Вілінава, Катэрка, Такары, Клюкавічы і Зубачы. Гэты рэгіён багаты лясамі, чыстым паветрам і такой жа вадой. Цудоўныя краявіды, даўняя драўляная архітэктура вясковых забудоў, купалы цэркваў, стральчатыя вежы касцёлаў, прыдарожныя капліцкі і крыжы ствараюць незабыўнае ўражанне. На ўвагу заслугоўвае таксама гасціннасць пражываючых тут людзей і рэгіянальная кухня, аб чым маглі пераканацца ўдзельнікі фолькавых сустрэч „З вясковага панадворка” — цыклічнай імпрэзы, якая лічыцца адным з важнейшых культурных мерапрыемстваў Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе.

Апрача згаданага шляху Раман Туркевіч прапануе іншыя турыстычныя маршруты. Адзін з іх — „Шлях трох рэлігій (каталіцкай, праваслаўнай і яўрэйскай)”, даўжынёй 50 км, які пралягаў бы ад Драгічына праз Сямятычы і Мілейчычы ў Чаромху. Таксама 50-кіламетровы „Купецкі шлях” пачынаўся б з Чаромхі-Станцыі і пралягаў бы праз вёску Чаромху, Кляшчэлі, Елянку, Дубічы-Царкоўныя, Гайнаўку і канчаўся б у Белавежы. Апошні „Польна-лясны шлях” (51 км) праходзіў бы з Чаромхі праз Кузаву, Рэпчычы, Дабрываду, Чахі-Арлянскія, Вітава і Тапіла ў Белавежу.

Варта адзначыць, што Раман Туркевіч шмат вольнага часу адводзіць разметцы існуючых турыстычных шляхоў у самой Чаромсе-Станцыі. Спрабаваў ён таксама зацікавіць справай мясцовых радных. На жаль, беспаспяхова. Аргументы палымянага прыхільніка агратурызму і веласіпедных шляхоў, якія могуць пасадзейнічаць развіццю рэгіёна, не знайшлі зразумення ў чаромхаўскіх дэпутатаў. Ці ж ягоная ідэя памрэ сваёй смерцю?

**Уладзімір Сідарук**


Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

*Царква ў Зубачах ад 1897 года*

# *Кветкі вязаныя і жывыя*

У хаце Надзеі Турко ў Міленкаўцах, што ў Кузніцкай гміне, шэдэўры рукадзелля. З першага погляду захапіў мяне вышываны дыванок, што над дзвярмі, з жываколернымі кветкамі. Але найбольш у спадарыні Надзеі ажурных сурвэтак. Кожная аздобная пасудзіна ці вазон з кветкамі стаіць на адмысловай „падстаўцы”, карпатліва нанізанай вочка за вочкам працавітай гаспадыняй. І не плоскія яны, толькі трохмерныя, з прыпаднятымі быццам у кветкі пялёсткамі. І засланкі ў спадарыні Надзеі гафтаваныя, і абрусы, і ручнікі...

— Вучыцелька за польскім часам была, — кажа мне спадарыня Турко, — і вучыла. Мама кручком рабіла, і на прутках, і вышывала. Але вышываць то мяне найбольш навучыла вучыцелька, яшчэ ў Стараўлянах. Фуняй яе называлі, а муж быў


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Полё. Яны вельмі мяне любілі, дахаты запрашалі і я ў іх узоры падглядала.

Спадарыня Надзея Турко не толькі вышывае і вяжа грацыёзныя кветкі. І жывыя кветкі з’яўляюцца яе карпатліва даглядаемымі любімцамі. Вакол панадворка поўна кветак, традыцыйных, якія калісь садзілі нашы вясковыя гаспадыні, якія раслі і каля маёй хаты. І вялікая старая яблыня, што дастойна высіцца перад хатай спадарства Надзеі і Яна Турко, таксама абсаджаная кветкамі. А ўсе кветкі абложаны камянямі, памаляванымі снежна-белай вапнай.

І хіба не толькі спадарыня Надзея Турко любіць свае кветкі, але і кветкі гэтыя любяць сваю дбайную гаспадыню. Вось адна з іх, мальва-матылёк, вырасла ў бетоннай шчыліне парога, перад самымі дзвярмі ў хату. І нягледзячы на тое, што кветку закранула кола трактара, яна ўсё ж такі багатым суквеццем радуе сваіх гаспадароў, якія беражна шануюць гэты свайго роду цуд.

**Аляксандр Вярбіцкі**

# *Погляд з ровара*

*Не паспеў я выслаць па электроннай пошце карэспандэнцыю ў „Ніву”, а яна за тыдзень даходзіць да чытача. Не паспеў я спаткацца з сябрам і аб гэтым неўзабаве ведаюць беларусы на антыподах. Вось, у якой глабальнай вёсцы жывём.*

*Хіба ж паспрабуем жыць, напрыклад, у Кляшчэлях, якія ператварыліся з вёскі ў горад і далей існуюць як вёска. Хацеў я ў гэтым мястэчку купіць „Газету”, каб проста пачытаць. Якраз меў я такую нагоду, што ніхто не папракаў мяне ў тым, што я зноў чытаю, але газету купіць не ўдалося. І не ўдалося мне купіць святочнага выдання „Газеты” на Гайнаўшчыне праз цэлы месячны перыяд маіх веласіпедных вандровак. Быў гэта час вандровак, але і час адпачынку, і гэты якраз час хацеў я выкарыстаць на чытанне.*

*Вядома, летні гарачы рабочы час, каму там у галаве пісанае слова. Але калі так шыкарна арганізуецца турыстычная база, то турыстам не толькі трэба запэўніць „бровар”, але і штосьці для духа. Думаю, што гэтаю, як і іншыя заўвагі возьмуць да сэрца, не толькі ўласнікі агратурыстычных кватэр, але і адказныя за арганізацыю турызму вакол Белавежскай пушчы.*

*Трэба пахваліць ПТТК за адпаведна пазначаныя веласіпедныя сцежкі. Але калі падняўся грыбом, лезь у каробку. Найлепш будуць ведаць, аб чым я гавару, адказныя за стварэнне сцежак, калі самі праедуцца па ўсіх адрэсках гэтых сцежак і калі ўжо стомяцца, то будуць ведаць, што веласіпедысту дзесьці трэба прысесці і адпачыць....*

*Маю таксама прапанову ўласнікам агратурыстычных кватэр: няхай, заманіўшыся з суседам кватэрай, пажывуць некалькі дзён, абавязкова некалькі, як турысты. Думаю, што тады даведаюцца чаго бракуе і што дакучае турысту ў такой агратурыстычнай кватэры. А потым шчыра скажуць суседу, каб нешта зрабіць са сваім або суседавым сабакам, якога ўсяночнае адпалохванне зладзеяў проста не дае спаць. А калі ўсё будзе ў парадку, то, мабыць, за год або раней зноў завітае да яго знаёмы турыст, хацяі навокал многа гатовых падабраць яго да сябе канкурэнтаў.*

*Як і ў мінулым годзе, нічога не паправілася ў галіне інфармацыі на веласіпедных сцежках. Трэба зразумець, што турыст усяго цікавы. Мала таго, што стаяць указальнікі, каб не блудзіць, то трэба яшчэ паінфармаваць турыста, чаму будзе яму цікава павярнуць у тую ці іншую вёсачку...*

*У павятовай управе ў Гайнаўцы чыноўнікі не толькі выслухалі маіх заўваг наконт арганізацыі павятовага турызму з пункту гледжання індывідуальнага веласіпеднага вандроўца, якому яшчэ залежыць каб гайнаўскі турызм развіваўся, але і запісалі іх, каб не забыць. А так пры нагодзе, невядома ці гэта праўда, прынамсі так людзі ў Махнатым казалі, што будзе асфальтаваная гравейка з Махнатага праз Дубічы-Асочныя, Хітрую ў Гайнаўку. Добра было б, каб пры той дарозе была размечана веласіпедная сцежка.*

*У Бельску ў павятовай управе праблема развіцця турызму не існуе. Там няма адказнай асобы, якой на сэрцы ляжалі б праблемы турызму і турыстаў у павеце. Ну, можа апрача Міхала Мінцэвіча, які на старонках „Нівы” паказвае, што Бельскую зямлю варта наведваць...*

***Міхась Куптэль***

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 003 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Непітушчыя

*— Мяне завуць Марк. Я алкаголік, — пачынае сваё выступленне адзін з уппавы Клуба ананімных алкаголікаў „Заранка” ў Супраслі. Клуб АА праводзіць сёння свой мітынг, сямігоддзе свае дзейнасці ды заадно баль для каля трохсот асоб, сярод якіх ёсць і яны, члены клуба, іх сябры ды госці. Хоць Марк прызнаецца, што ён алкаголік, ён перамог гэтую страшную хваробу, так як і яговыя сябры, ды ў сапраўднасці алкаголікам застаешся назаўжды. Гэтае прызнанне прыпамінае ім таксама, якая тонкая лінія паміж тым, што ты піў, а цяпер не п’еш, але ў кожную хвіліну можаш сягнуць па кілішак, калі б не твая моцная воля, рашэнне ды падтрымка сяброў, сям’і, лекара, духоўніка... Ад гарэлкі ўміраюць. Яна руйнуе пачуцці, сям’ю.*

*— Вы ўжо цяпер заранка ў вашых дамах, сярод вашых блізкіх, суседзяў. Калі чалавек наважыцца на змаганне з самім сабой, калі засвітае да яго заранка з дабравесцю, што будзе лепш, — тады пераможа, — казаў святар каталіцкага прыхода Святой Тройцы ў Супраслі. — Я пры вас малы, хоць я росту высокага, бо не паставіў мяне лёс перад такім змаганнем. Вы — героі, і ўжо пераможцы. Вы можаце сказаць аб пекле алкагалізму, і змагаецеся са злом з адкрытым забралам, без сораму. — Ксёндз Анджэй жартаваў, што калі абыходзіць прыход на Каляду, дык некаторыя прыхаджане ўздымваюць яго частаваць кілішкам, тады кажа, што не можа выпіць, бо мае „ўшыўку”. Вось пойны канфуз!*

*— Хто нам падаў адкрытую руку, а не кілішак? — пыталіся сабраныя. Перш за ўсё лекары, калі чалавек перамог сорам, бязвольнасць і рашыўся жыць у цвярозасці. Усе яны разам узяліся за цяжкі труд цвярозасці і гэта аграмадны поспех гэтых людзей, якія змагаюцца з залежнасцю, і кіруе імі любоў да самих сябе і да іншых...*

*Была нагода і да сустрэчы з прадстаўнікамі іншых асяродкаў цвярозага жыцця — былі госці з клуба абстынентаў „Свабода” з Харошчы (неўзабаве і ў іх гадавіна — 12-годдзе), „Арка” ды „Вясёлка” з Беластока, Клуба „Дуб” з Гайнаўкі. Ігралі гурт маладых музыкаў, якіх блізкія таксама перамагаюць алкагольную хваробу. Амаль да белага рання гулялі на балі, бо інакай не назавеш святочна апранутую кампанію вірую́чую ў аздобленай зале сельскагаспадарчай школы ў Супраслі, у колькасці вясельнікаў немалога вяселля, ды зусім без „запойкі”, а адно ласункамі ды больш канкрэтным пачастункам (задбалі аб гэта спонсары). Што цікава, сярод танцуючых было шмат знаёмых сяброў клуба, якія ўсе такія антыалкагольныя мерапрыемствы маюць у сваім спіску танцавальных вечароў. І ездзяць то ў Гайнаўку, то ў Высокае-Мазавецкае, то ў Аўгустаў, то ў Чорную-Беластоцкую, то ў Харошчу, то ў Элк, то і яшчэ далей.... Здорава гуляюць! Відаць, такая мода!*

*Вось адрасы клубаў сучасных волатаў:*

*Fundacja Biuro Służby Krajowej Anonimowych Alkoholików w Polsce, Punkt Informacyjno-Kontaktowy AA, Białystok, ul. Broniewskiego 1 „a”, тэл.* **651 46 30;** *Białostockie Stowarzyszenie Klub Abstynenta* ***„Tęcza”****, Białystok, ul Antoniukowska 60, tel. 662 08 21; Klub Abstynenta* ***„Arka”****, Białystok, ul. Boboli 5, tel. 661 92 62; Klub Abstynenta* ***„Krokus”****, Białystok, ul. Sienkiewicza 3, тэл.* **743 58 43;** *Poradnia Terapii Uzależnień i Współuzależnień, Dorota Bielonko, ul. Słonimska 15 lok. 1, тэл.* **740 45 50;** ***„Jutrzenka”*** *Supraskie Stowarzyszenie Klub Abstynentów, Supraśl, ul. Piłsudskiego 3, тэл.* **710 85 00;** *Klub Abstynenta* ***„Promień”****, Bielsk Podlaski, ul. Sienkiewicza 11 „a”, tel. 730 52 59; Klub Abstynenta* ***„Świt”****, Czarna Białostocka, Torowa 9, 710 23 06; Klub Abstynenta* ***„Dąb”****, Hajnówka, ul. ks. Worobieja 22, tel. 873 12 08;* ***„Ignis”*** *Siemiatyckie Stowarzyszenie Abstynentów, Siemiatycze, 11 Listopada 44, тэл.* **655 69 51;** *Klub Abstynenta, Krynki, Piłsudskiego 4, тэл.* **722 82 79...**

**Міра ЛУКША**




## З РЭДАКТАРА — НА СЕНАТАРА

**№ 11** *на спіску ў Сенат*

Уладзіслаў
ПРАХОВІЧ

*— Ад 21 год, як журналіст Польскага Радыё ў Беластоку, я амаль Ваш сямейнік. Добра ведаю гэтую зямлю, яе людзей ды іхнія праблемы...*

*www.prochowicz.republika.pl*

**Незалежны кандыдат у сенатары РП**

(Платная выбарчая аб’ява — Komitet Wyborczy Wyborców Kandydata na Senatora Władysława Prochowicza, wybory do Sejmu i Senatu zarządzone na 25 września 2005 г.)


## *Афарызмы* Ладзіка Майніча

**Дэкларацыя правоў**

*Кожны правы мае права налева.*

*

*Кожны пешаход мае права галасаваць.*

*

*Кожны аўтамабіліст мае права на дэмабілізацыю.*

*

*Кожная птушка мае права на мушку.*

*

*Кожны дом мае права на парог.*

*

*Кожны гром мае права на маланку.*

*

*Кожны дзень мае права з ранку.*

*

*Кожная каса мае права на галаву.*

*

*Кожная раса мае права на траву.*

*

*Кожны хам мае права на хамут.*

*

*Кожны даход мае права на дах.*

*

*Кожная мастачка мае права на афорт.*

*

*Кожны келіх мае права быць разьбітым на шчасьце.*

*

*Кожны ліфт мае права на першы паверх.*

*

*Кожны ліст мае права на падзеньне.*

*

*Кожны футбаліст мае права на „сухіліст”.*

*

*Кожны зямляк мае права на зямлю.*

*

*Кожны кулак мае права на фігу.*

*

*Кожная рыба мае права маўчаць.*

*

*Кожны чорны мае права паставіць на белае.*

*

*Кожны белы мае права на чорны гумар.*

*

*Кожны шахматыст мае права на мат.*

*

*Кожны цьвік мае права быць забітым.*

*

*Кожны баран мае права на новыя вароты.*

*

*Кожны джын мае права на бутэльку.*

*

*Кожная мыш мае права на кампутар.*

*

*Кожны край мае права на рай.*




# Адгаданка

1. бальшавіцкі палітычны кіраўнік ваеннай часці, 2. паміж восенню і вясною, 3. слаўнае возера каля Мядзёла, 4. Пятрусь, беларускі паэт, аўтар „Кацярыны” (1905-80), 5. жанчына, у якой памёр муж, 6. Аляксей, кампазітар оперы „Кветка шчасця” (1886-1958), 7. не сястра, 8. ядавітая змяя факіра з плямамі ніжэй галавы, 9. гумавы або металічны абруч на вобадзе кола, 10. невялікі швейны цыліндр для намотвання нітак. (ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — народная пагаворка.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 32 нумара**

Лоеў, Тарасевіч, акно, бас, хан, Невель, Енісей, гейзер, іней, Жылка, Каін. Рашэнне: **Старое каханне не гніе і не ржавее.**

Узнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

# 18.09 – 24.09



**Баран (21.03. — 19.04.)** Каханне табе ўсё даруе, калі ты ў пастаяннай пары. Расчаруе цябе, калі гонішся за прывідам. Толькі грошы кахаюць цябе безумоўна. Рызыка нястрашная, а вынікі — задавальняючыя.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Не вер у бескарыслівасць асоб, якія вечна наракаюць альбо шукаюць у іншых заган. Да 20.09. могуць табе папсавацца прафесійныя планы. Трымайся здалёк ад падазроных інтарэсаў, асабліва з 22.09.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Няспынныя гонкі давядуць да парадку. Уратуюцца пары, якія ў апошні час мелі складанасці. Сябры могуць здацца занадта крытычнымі і ўчэплівымі, але яны хочуць табе дабра. Непаразуменні высвятляй адразу.

**Рак (22.06. — 22.07.)** З 23.09. (да 27.09.) можа дайсці да канфрантацыі з непрыхільнымі табе асобамі, якія не бачаць далей кончыка ўласнага носа. Ажыўленне ў кампанейскіх кантактах. Прыдасца аварыйны план на нечаканую падзею, што можа здарыцца да 20.09.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Да 20.09. не адкладвай файнага падарожжа. Не прадбачваецца вялікая любоў, але вельмі гарачая прыгода чакае за парогам. Лёгка выкараскаешся з фінансавага „долу”.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Прыемныя сустрэчы, паездкі. Здзейсніцца амаль усё, аб чым марыш, можа, апрача мрояў пра касмічную любоў. На новым месцы будзь кампетэнтная, ды сціплая.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Будзеш так запальваць уяву іншых, што кожнага абкрунеш вакол свайго пальца. Нават калі кінеш працу, грошай табе хопіць. Не раздзірай старых ран.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Ад 19.09. можаш парывацца нават з матыкай на сонца — разлічвай выключна на поспехі. Ты цяпер дзіця шчасця і ўлюбёнец Амура. Блісьнеш талентамі! Не выдавай больш, чым зарабляеш.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Да 20.09. ты вельмі моцны духам. На працы з ахвотай закоціш рукавы і кінешся на заданні. Не забывай, што словы кахання варта казаць ды чуць і пасля шлюбу.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Да 20.09. адпусці сабе любоўныя спатканні. З 23.09. (да 27.09.) рыхтуйся выкарыстоўваць час спрыяльны для рэалізацыі прафесійных планаў; памогуць і кіраўніцтва, і калегі.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Да 20.09. гарантаваныя поспехі ў грашах і каханні. Завалачы пад вянец цябе цяжка, але кінуцца ў вір неабавязваючых раманаў ты гатовы. Магчымыя сэнсы з шэфствам.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** 18-22.09. можаш разлічваць на казачны клімат і магічную атмасферу ў пары. З 22.09. страціш ілюзіі — асоба, да якой уздыхаеш, ніякі не ідэал і няма ў яе цікаўнасці да цябе. Сэрца вызваліцца! Непаразуменні на фінансавым фоне могуць стаць правалам для сяброўства. Дбай аб пазваночнік, страўнік ды пячонку — надта моцна адбіваюцца на іх твае стрэсы.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960